Пралетарыі усіх краін, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагароднія	— 20 к.
гісцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шпальтовага тэксту	— р. 50 к.
За радок шпальтовага паперод тэксту	1 р. — к.
За радок шпальтовага перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. дарожэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 такумаг	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за такумаг	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 85 (2274) Серада, 11-га красавіка 1928 г.

Польскія майстры ашуканства.

Новы сойм, выбраны па ўсіх правілах паліцэйскага мастацтва сабраўшыся ў новым памяшканьні, павінен быў адчыніць новую эру ў жыцьці Польшчы—сваімі пастановамі пацьвярджаць усе загады ратаўніка Польшчы—маршала Пілсудзкага, яшчэ пры жыцьці ўведзенага ў сан свайго роду рымскага папы,—загады і пастановы якога не падлягаюць крытыцы і павінны выконвацца сьлепа і без пярэчаньня.

Злыя языкі сьцьвярджаюць нават, што і новае памяшканьне сойму, вельмі нездавальняючае ў адносінах акустыкі, спэцыяльна прыстасавана для гэтай мэты. Дэпутаты могуць **ня слухаць, аб чым гавораць, павінны толькі быць паслухмянымі.**

І ня толькі памяшканьне, але ўсё было для гэтага прыстасавана. Ня было ўлічана толькі адно. За два гады польскія масы ўзрасьлі. І гэта адбілася ня толькі на тым, што кампанія Польшчы, ня гледзячы на лютыя рэпрэсіі і ашуканства, правяла ў сойм 7 дэпутатаў і што на выбарах пададзена за яе каля мільёну галасоў. Ня толькі на гэтым. З гэтым палявеньнем мас ня могуць ужо ня лічыцца і згодніку, выціснутыя камуністамі з гэткіх рабочых цэнтраў, як Варшава, Лодзь, Дамброўскі каменна-вугольны райён, і прымушаныя пакрываць свае страты ў сялянскіх раёнах, наступаючы на больш правыя партыі. Перад ППС, як гэта адвадушна адзначае і ўся буржуазная прэса, рубам паўстала пытаньне аб яе існаваньні. Пагроза быць канчаткова выкінутай з рабочых раёнаў прымушае гэтую згодніцкую партыю ва ўсіх тых выпадках, калі масы могуць адмоўна адносіцца да яе выступленьняў, прыкрываць гэтыя выступленьні фальшывай апазіцыйнасьцю. Гэтым тлумачацца тыя апазіцыйныя гэсты, якія прароблены пэпэсаўцамі ў першы дзень адчыненьня сойму.

Калі дыктатар у парушэньні «сьвяцейшых» парляманцкіх асноў увёў у сойм паліцэйскіх, якія пад камандай міністра ўнутраных спраў зьбівалі дэпутатаў-камуністаў і буквальна цягнулі іх у турмы, згодніку былі абураны, «пратэставалі» сьпевам, але ў іх не хапіла адвагі хоць бы толькі дэманстратыўна пакінуць залю пасяджэньняў сойму, у якой чынілася гэтая расправа.

Не пратэставаць яны не маглі. Яны ведалі, як будуць на гэта рэагаваць рабочыя масы, якія зараз жа выступілі на вуліцу з пратэстам. Гэты страх перад масамі прымусіў згодніцкія партыі зрабіць гэст, які да шаленства давёў дыктатара. Сам маршал Пілсудзкі меркаваў у старшыні сойму міністра Бартэля, а яны правялі ў старшыні не яго, а старога блізкага прыяцеля і супольніка Пілсудзкага, лідэра ППС—Ігната Дашынскага. Гэта было зроблена для мас. «Гляньце, якімы адважныя. Не падтрымалі кандыдата Пілсудзкага. Правялі свайго». Але як толькі гэты гэст быў зроблен, «апазіцыйны» старшыня зрабіў рэвэранс па адрасу ўсемагутнага дыктатара:

«Пагоджанае супрацоўніцтва ўраду з соймам,—заявіў Дашынскі ў першай сваёй прамове, як старшыня гэтага сойму,—лояльнае супрацоўніцтва, супрацоўніцтва бяз узаемных раздражненьняў будзе праводзіцца высокай палатай са шчырай гатоўнасьцю разгарнуць яго да як мага шырэй».

І далей: «Дазвольце мне выказаць глыбокае перакананьне ў тым, што пры наяўнасьці добрай волі з абодвых бакоў нам удасца скарыстаць нашы вялікія паўнамоцтвы і вялікія абавязкі на карысьць краіны і народу на службе бацькаўшчыне».

Пілсудзкі ўзяў пад увагу маленьні Дашынскага. Сойм не разагнаны, яго прыхільнікі згадзіліся, ня гледзячы на правал Бартэля, прыняць удзел у камісіях. Праўда, Пілсудзкаму і без таго цяжка было ў той момант разагнаць сойм. Хоць бы толькі для заграніцы трэба было, каб «народныя выбаршчыкі» зацьвердзілі каштарысныя меркаваньні. Але згодніку, спалохаўшыся ўласнай адважлівасьці, не абмежаваліся адным вернападданым паклонам. Яны на справе паказалі, што «апазіцыйны» старшыня ня горш любога Бартэля будзе закрываць вусны старшыням рабочае клясы і нацыянальных меншасьцяў, і спынілі спрэчкі якраз у той момант, калі камуністычныя дэпутаты павінны былі выступіць у спрэчках па каштарысу. Так м чынам, і «нявінпасьць была захавана» і капітал добрых адносін Пілсудзкага нажыты.

Сойм, кіруемы такім «апазіцыйным» старшынёю, перад якім, дарэчы сказаць, схіляецца ўся буржуазная прэса, называючы яго „вельмі паважаным", „заслужаным" і «дзячом», зацьвердзіў каштарыс і разышоўся па сваіх памяшканьнях на сьвята.

А згодніку для таго, каб атрымаць прыхільнасьць мас, унесьлі прапанову аб амністыі для палітзьняволеных. Яны ведаюць, што сойм адхіліць гэтую прапанову, але яны выходзілі з аднаго: «Нам гэта нічога не каштуе, а ім зробіць гэткую вялікую прыемнасьць».

Сыстэма двурушніцтва,—вось тое, што згодніцкія партыі паклалі ў аснову сваёй сойм авой і па-за соймавай палітыкі. Але ўжо тое, што яны прымушаны да гэтага, прымушаны, прымаючы пад увагу настроі мас, вельмі характэрна і паказальна.

КАНФЛІКТ МІЖ ЯПОНІЯЙ І ЧЖАН-ЦЗО-ЛІНАМ.

ТОКІЁ, 9-4. Канфлікт між праўленьнем Паўднёва-Манчжурскае чыгункі і кітайскаю ўладаю, які выклікан захопам кітайскаю чыгуначнаю ўладаю па здоў Таонань-Ангуанскае чыгункі (вэтка Паўднёва-Манчжурскае чыгункі), як і раней зьяўляецца цэнтральным пытаньнем японска-кітайскіх адносін.

Водгук паведамленьня дайрэнскага карэспандэнта «Осака Майініцы», у Мукдэне адбылася нарада між японскім консулам у Мукдэне, камандаваньнем разьмешчаных у Мукдэне японскіх вайсковых часьцей і прадстаўнікамі праўленьня Паўднёва-Манчжурскае чыгункі. Нарада ўхваліла рэзалюцыю, у якой гаворыцца: „Калі Кітай будзе, як і раней, ня лічыцца з пратэстамі Японіі адносна канфлікту, дык праўленьне Паўднёва-Манчжурскае чыгункі павінна ўжыць сілу, каб забясьпечыць свае законныя правы.

Такая-ж нарада адбылася ў Квантуне (вобласьць, якая арандуецца Японіяю, але фактычна зьяўляецца японскаю тэрыторыяю). Нарада патрабуе звольніць асоб, адказных за інцыдэнт, спыніць пабудову канкуруючае Мукдэн-Хайлунскае чыгункі і паслаць японскае войска на чыгуначны вузел Лаоюань.

ЧАН-КАЙ-ШЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ „НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СПРАВЫ".

ТОКІЁ, 9-IУ. Водлуг паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Ханькоу, кітайская ўлада пачынае кампанію за зварот Кітаю французкага сэнтыльменту. Кампанія выклікана адмоваю французкага консула задаволіць патрабаваньне кітайскае ўлады аб выдачы 70 камуністаў, якія нібы хаваюцца на тэрыторыі французкае канцэсіі.

Улада французкае канцэсіі ўжывае адпаведныя вайсковыя захады асьцярогі.

Новыя перамогі камуніст. войск.

НЬЮ-ЁРК. Паведамляюць, што кіруемае камуністамі рэвалюцыйнае войска ў ліку 3000 захапіла гарады Іенчуні і Іенгон, у правінцыі Гуандунь. Гарнізоны апошніх адмовіліся выступіць проці рэвалюцыйнага войска, спачуваючы камуністам.

ХАЙФЫНЬ І ЛУФЫНЬ У РУКАХ КАМУНІСТАЎ.

НЬЮ ЁРК, 9-4. Агенцтва „Асашыэйтэд Прэс" паведамляе, што рэвалюцыйнае войска пад кіраўніцтвам камуністаў выгнала ўрадавае войска з паветаў Хайфынь і Луфынь (на паўднёва-ўсходнім узьбярэжжы Гуандуньскае правінцыі).

Прыезд Залескага ў Італію.

АЦЭНКА ПРЫЕЗДУ ЗАЛЕСКАГА Ў ФАШЫСЦКАЙ ПРЭСЕ.

РЫМ, 9-4. У Італію прыехаў польскі міністр замежных спраў Залескі, які ў сучасны момант знаходзіцца ў Вэнецыі. Прыезду яго ў Рым, дзе ён мецьме спатканьне з Мусаліні, чакаюць 13 красавіка. Газэты прысьвечаюць прыезду Залескага артыкулы, прычым артыкулы гэтыя, як відаць, зьяўляюцца пераказам аднаго і таго-ж тэксту. Газэты падкрэсьліваюць палітычнае значэньне прыезду Залескага, які 4 гады быў пасланьнікам у Рыме, падпісаў з Італіяю гандлёвы ўгавор, а таксама і першую польскую пазыку ў Італіі. Далей адзначана, што „Польшчы прышлося патраціць шмат сіл, каб зьмягчыць варожыя адносіны да яе Нямеччыны і СССР".

Значнае месца адведзена характарыстыцы польска-савецкіх адносін. «Пілсудзкаму,—гаворыцца ў гэтых артыкулах,—удалося паўней высьветліць адносіны з СССР, з якім з пераменным посьпехам вядуцца гандлёвыя перамовы".

У канцы газэта зазначае на палепшаньне адносін між Польшчаю з аднаго боку, і Турцыяю і Пэрсіяю—з другога, і прыходзіць да выводу, што Польшча, якая імкнецца да ўстанаўленьня міру і роўнавагі, цэніць прыязьнь Італіі. Прыгэтым зазначана, што апошняя гатова пайсьці Польшчы насустрэч.

Бяспрыкладны шантаж пуанкарыстаў.

ПАРЫЖ, 4-4. Кіраўнік рэакцыйнае газэты «Фігаро» і вядомы фабрыкант парфумы Коці падрыхтоўвае выданьне новае газэты «Прыяцель Народу». Газэта прызначана для масавага чытача і павінна служыць мэтам барацьбы з камунізмам.

Левы друк абуран назваю газэты, якая аднаўляе назву органу Марата.

Няўвязка між імкненьнямі амэрыканскіх дзелавікоў і палітыкаю белага дому.

Дзелавыя колы Амэрыкі шукаюць шырэйшых сувязаў з СССР.—Вялікія прыватныя крэдыты для СССР у Амэрыцы.

АЦЭНКА АМЭРЫКАНСКАЙ ПРЭСАЙ ЗАЛАТОГА ІНЦЫДЭНТУ. ІМКНЕНЬНЕ АМЭРЫКАНСКІХ ДЗЕЛАВІКОЎ ПАШЫРЫЦЬ САВЕЦКА-АМЭРЫКАНСКІ ГАНДАЛЬ.

НЬЮ-ЁРК. „Нью-Ёрк Таймс" піша: у фінансавых і прамысловых колах лічаць што савецкі ўрад лёгка атрымае кантроль над адасланым Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі ў Нямеччыну сваім золатам, а потым ізноў адашле яго назад у Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты і, такім чынам, дасягне першапачатковае мэты.

«Джорналь оф Комарс» піша: «Выступленьне французкага банку зьяўляецца толькі ўколам шпількі», у параўнаньні з вялікімі цяжкасьцямі на шляху разьвіцьця савецка-амэрыканскага гандлю, створанымі адмоваю ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў устанавіць выразную асноў дзеля гандлю з СССР».

У гутарцы з прадстаўнікамі банкаўскіх колаў і юрыстамі, сьвядомымі ў савецка-амэрыканскіх гандлёвых зносінах, карэспандэнт ТАСС высьветліў, што адносіны ўраду Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў да савецка-амэрыканскіх гандлёвых зносін былі, ёсьць і як выдаць будуць вельмі нявыразнымі. Інцыдэнт з савецкім золатам ізноў высоўвае пытаньне, наколькі абгрунтавана заява ўрадавых колаў, быццам напрыязнаньне СССР не перашкаджае разьвіцьцю савецка-амэрыканскіх гандлёвых зносін.

У дзелавых колах падкрэсьліваюць супярэчнасьці між адмоваю ўраду Паўночна - Амэрыканскіх Злучаных Штатаў прыняць савецкае золата і вольным продажам савецкае плятыны на амэрыканскім рынку. На запытаньне—якая розьніца між золатам плятынаю, адказваюць, што розьніцы ніякае няма, за выключэньнем таго, што золата павінна прайсьці праз прабірную палату Паўночна - Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, у той час, як плятына мае вольны продаж на рынку. Не зважаючы на інцыдэнт з золатам, усё-ж выразна відаць рашучасьць кіруючых фінансавых і дзелавых колаў трымаць напрамак на курс пашырэньня савецка - амэрыканскіх гандлёвых зносін.

ЗАКУПКІ СССР У ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ.

НЬЮ ЁРК. 9-4. („Амторг") агаласіў даныя аб савецкіх закупках у Злучаных Штатах за сакавік месяц. За гэты месяц СССР закупіў у Злучаных Штатах **абсталяваньня** *для прамысловых прадпрыёмстваў* **на 2.284.000 даляраў.** *Гэтая сума зьяўляецца рэкорднаю за ўвесь час існаваньня савецка-амэрыканскага гандлю. „Амторг" зазначае, што, не зважаючы на адмову міністэрства фінансаў узяць савецкае золата, амэрыканскія дзелавыя колы пашырылі зьдзелкі з СССР і далі крэдыты на больш доўгія тэрміны. За набытае ў сакавіку абсталяваньне для прамысловых прадпрыёмстваў грашыма выдадзене толькі 23 проц. кошту. Рэшта-ж крэдытавана амэрыканскімі фірмамі. За сакавік „Амторг" закупіў у Злучаных Штатах* **тавараў на суму 4.400.000 даляраў.** *Сярэдняя месячная норма закупак «Амторгу» ў Злучаных Штатах за мінулы год склала 2.700.009 даляраў.*

* * *

НЬЮ-ЁРК, 9-4. Міністэрства сельскае гаспадаркі Злучаных Штатаў вымушае паведамленьне, што сельская гаспадарка СССР дасягнула даваеннага ўзроўню, а культура некаторых с.-г. расьлін нават перавышае даваенны ўзровень. У паведамленьні зазначаецца, што ўзросшае ўнутры СССР спажываньне прадукцыі сельскае гаспадаркі выклікала некаторае вымяншэньне хлебнага экспорту з СССР, г. зн. паслабіла канкурэнцыю для экспорту хлеба са Злучаных Штатаў.

АМЭРЫКАНСКІ ВУЧОНЫ АБ ДАСЯГНЕНЬНЯХ ПЭДАГОГІКІ Ў СССР.

НЬЮ-ЁРК, 25-III. На 8-й штогадовай канфэрэнцыі амэрыканскае прагрэсыўнае пэдагагічнае асацыяцыі дзеля распрацоўкі найбольш перадавых мэтадаў пэдагогікі выступіла доктар Люсі Вільсон, якая нядаўна вярнулася з СССР, дзе вывучала пастаноўку асьветнае справы.

Д-р Вільсон заявіла, што ў СССР з посьпехам ужываюцца тыя пэдагагічныя тэорыі, якія ў Злучаных Штатах знаходзяцца яшчэ ў экспэрымэнтальнай стадыі. „Расейскіх дзяцей,—заявіла Вільсон,—ня прымушаюць запамінаць сотні фактаў. Дзеці вучацца ў працэсе вырашэньня практычных пытаньняў».

Вельмі добра Вільсон адгукнулася аб рабочых факультэтах.

ПРАГРЭС ЗДРАДЫ РАБОЧЫМ ІНТАРЭСАМ У АНГЛІІ.

НОВЫ НАСТУП ГЕНРАДЫ НА ЛЕВЫ ПРАФРУХ.

ЛЁНДАН, 3-IУ. На бліжэйшым пасяджэньні генэральнае рады ангельскіх прафсаюзаў, якое адбудзецца 25 красавіка, генэральны сэкратар саюзу кацельшчыкаў Джон Хілл падасьць рэзалюцыю, якая ставіць шырока пытаньне аб дзейнасьці камуністаў і членаў руху меншасьці ў прафсаюзах.

Згодна слоў „Сэндэй Уоркер", рэзалюцыя фактычна патрабуе выключэньня камуністаў і членаў руху меншасьці з прафсаюзаў. У шмат-якіх выпадках гэта будзе зьяўляцца скрытаю рэпрэсіяю, бо ў некаторых галінах прамысловасьці захаваньне працы ставіцца ў залежнасьць ад сяброўства ў саюзе.

Рабочая па назьве, варожая рабочым—па сутнасьці.

КАНФЭРЭНЦЫЯ НЕЗАЛЕЖНАЕ РАБОЧАЕ ПАРТЫІ.

ЛЁНДАН, 8-IУ. Учора ў Норвічы адчынілася канфэрэнцыя незалежнае рабочае партыі. У дакладзе выканкому нама ні намёку на аналіз становішча ангельскага капіталізму, ці пытаньняў ангельскага рабочага руху, зьвязаных з сучаснымі суадносінамі сіл працы і капіталу ў Англіі.

Па пытаньні аб адносінах партыі да „Лігі Барацьбы проці імпэрыялізму і калёніяльнага прыгнечаньня" выканком бярэ да ведама і кіраваньня пастанову 2-га Інтэрнацыяналу, што ніводная партыя, якая ўваходзіць у 2-гі Інтэрнацыянал, ня можа ўступіць у «Лігу Барацьбы проці імпэрыялізму і калёніяльнага прыгнечаньня», аднак, на думцы выканкому, гэтая пастанова ня можа служыць перашкодаю для асобных членаў партыі актыўна ўдзельнічаць у дзейнасьці «Лігі Барацьбы проці імпэрыялізму і калёніяльнага прыгнечаньня»

«Вялікая ўвага была аддадзена ў працягу ўсяго голу міжнароднаму становішчу СССР і Кітаю—гаворыцца далей у дакладзе.—Аднак нова а крызісу ў гэтым пытаньні не наглядалася, тым ня менш, небясьпека нападу на гэтыя краі застаецца ў моцы і прымушае партыю быць і ў будучым пільнаю".

Не зважаючы на шмат вострых выступленьняў дэлегатаў, даклад выканкому быў ухвалены.

ЯК ЯНЫ „БАРОНЯЦЬ" ІНДУСКІХ РАБОЧЫХ.

ЛЁНДАН, 2-4. У Лёндан вярнуліся Пэрсель і Холсворт, дэлегаты ангельскае генэральнае рады трэд юніёнаў на зьезьдзе індыйскіх прафсыянальных саюзаў. Ухіліўшыся ад апэлі палітычнага становішча ў Індыі, Пэрсель сказаў: уся нашая ўвага была аддадзена становішчу індыйскіх рабочых, якое зьяўляецца вельмі дрэнным. Міліёны работнікаў—мужчын, жанчын і дзяцей — падпадаюць самай бязьлітаснай эксплёатацыі; вялічэзныя вылікі робяць заработак зусім нязначным. Усюды пануюць беднасьць і хваробы.

Адносна задач індыйскага прафсыянальнага руху Пэрсель заявіў: «Неабходна зараз жа распачаць арганізацыю новых прафсаюзаў дзеля барацьбы за павялічэньне заработку і палепшаньне ўмоў жыцьця рабочых». Аднак, індыйскія рабочыя, на думку Пэрселя, павінны „рашуча адхіліць гульню палітычных дзеячоў усіх масьцяў". Заява Пэрселя, якая зьяўляецца «пропаведзьдзю» «эканамізму», лічыцца ў ангельскіх рабочых колах вельмі характэрнаю для пазіцыі генэральнае рады.

ЗА ДЗЕНЬ.

Беларусы ў новым сойме.

№ 23 Віленскай «Беларускай Крыніцы»—органу хрысьціянскіх дэмакратаў-каталікоў—абгаварвае ў перадавым артыкуле справы беларускага прадстаўніцтва ў новым сойме.

«Мы беларусы—кажа „Б. К."—ад гэтых выбараў спадзяваліся нямнога, бо ясна бачылі ўсе тыя труднасьці, якія стаялі на дарозе выбарнае працы. А перашкоды гэтыя былі вялізарныя: звонку—труднасьці паліцэйскія, а ўнутры беларускага грамадзянства—узаемная барацьба».

Клерыкальная газэта ня ўглыбляецца ў далейшым у тлумачэньні, паміж кім і кім вялася гэтая ўнутраная ўзаемная барацьба. Ды яно і само ясна. Не з Паўлюкевічамі-ж і Ўмястоўскімі, якія барацьбы з сабою наўрад ці вымагаюць. Барацьба вялася між сапраўды-радыкальнымі элемэнтамі беларускага грамадзянства і яго нібы-та таксама радыкальнымі, але моцна сфальшаванымі і няпэўнымі прадстаўнікамі, на якіх калі дзе і галасавалі, дык толькі таму, што ня было за каго іншага і лепшага як мы ведаем ужо, у сойм прайшло 4 беларусы па сьпіску рабочых і сялян, 2 сельсаюзьнікі, 2 хадэкі і 2 групы Станкевіча, а ўсяго—10. У сэнат прайшло 2. «Бел. Крыніца» кажа, што беларусы прайшлі ў сойм і з чужых сьпіскаў. Напрыклад, з урадавага сьпіску па Наваградчыне прайшоў у сойм беларус Макрэцкі, з таго-ж урадавага сьпіску ў Лідчыне прайшлі беларусы: пасол Шчэрба і сэнатар Сарока, а з Палесься прайшоў беларус з украінскага сьпіску. Калі-б усе гэтыя беларусы, прайшоўшыя ў сойм і сэнат па чужых сьпісках, далучыліся да іншых беларускіх груп і выступалі ў сойме і сэнаце, як беларусы, дык тады лік беларусаў у сойме раўняўся-б—13, а ў сэнаце—3. Гэта нават больш, чым у былым сойме. Але, на рад ці так будзе. Урадавыя беларусы, а таксама група (2) Я. Станкевіча наўрад ці далучацца да іншых беларускіх груп,—вярней—наўрад ці іх прымуць да сябе іншыя групы. Не гаворачы ўжо аб урадавых беларусах, аб Янку Станкевічу тая-ж «Бел. Крыніца» піша так: «Для зразуменьня цэласьці беларускіх адносін на соймавым грунце трэба таксама ўспомніць і аб п. Янку Станкевічу, які таксама апынуўся ў сойме. Асоба гэтага пасла зьвяртае на сябе асаблівую ўвагу беларускага грамадзянства. Папаў ён у сойм з польскай ласкі і апекі. Для мандату пасьвяціў ён сваё сумленьне і імя чэснага палітычнага грамадзкага дзеяча. Для таго-ж самага мандату п. Я. Станкевіч пайшоў, як гаворыцца, на ўсё, слушна здабываючы сабе сумную славу Паўлюкевіча і да рэшты трэцячы ў беларускім грамадзянстве ўсякую веру». Так пішуць аб Я. Станкевічу беларускія клерыкалы. Амаль што ні тое-самае пісалі аб ім радыкальныя беларускія газэты.

Бліжэйшая будучыня выявіць, дзеля якой мэты Я. Станкевіч пралез у сойм.

Па-за гэтымі падазронымі з нацыянальнага боку беларускімі пасламі у сойме будзе дзьве групы беларусаў: 1) паслы рабоча-сялянскай групы (4) з Гаўрылікам Язэпам на чале і сельсаюзьнікі з хадэкамі (4) з Ярэмічам на чале.

Восем чалавек ад усяе Заходняе Беларусі —гэта замала. Павінна-б было быць у разы тры больш.

Тодар Вярнікоўскі ў сваім, г. ё. дэфэнзыўным «Беларускім Слове» вылічае, што беларускіх прадстаўнікоў у сойме магло быць ад 25 да 30, каб яны слухаліся мудрых дырэктываў... польскай дэфэнзывы і Т. Вярнікоўскага.

Нам таксама думаецца, што пры нармальных умовах для выбараў, калі-б яны былі зусім вольнымі, дык Зах. Беларусь магла-б правесьці ў сойм да 25 асоб, але наўрад ці прапусьцілі-б беларускі народ хоць аднаго ня толькі «Т. Вярнікоўскага», ня толькі «Я. Станкевіча», але і хадэкаў і сельсаюзьнікаў.

Тым ня менш і пры найгоршых умовах Зах. Беларусь усё-ж мае сваіх прадстаўнікоў у сойме ў асобах чатырох рабоча-сялянскіх паслоў.

Пры сучасных польскіх умовах, калі польскі фашызм гняце вольнасьць Зах. Беларусі, трэба дзівіцца жывучасьці, настойлівасьці і надзвычайнай умеласьці народных мас і яе лепшых сыноў, ня здаўшых свайго нацыянальна-рэвалюцыйнага штандару.

Такім чынам, пяць міліёнаў залатых даляраў, якія належаць Савецкаму Саюзу, выратаваны. Дзесяць міліёнаў рублёў, якіх дамагаліся французкія імпэрыялісты, зьвернуты да нас і паступяць у агульны фонд індустрыялізацыі нашай краіны. Параход, на якім было пагружана нашае золата, бяз ніякіх перашкод варочаецца назад.

З самага пачатку інцыдэнту не толькі нам, але ўсяму сьвету ясна было, што арышт савецкага золата парушае нармальныя гандлёвыя зносіны, якія аднолькава патрэбны і нам і Амэрыцы. Загад аб арышце ня мае ніякіх карэньняў у інтарэсах самой Амэрыкі і быў дадзен толькі для таго, каб не псаваць узаемаадносін з Францыяй і некаторымі іншымі эўрапейскімі дзяржавамі, якія хацелі напужаць Савецкі Саюз залатой блёкадай. Зацікаўленасьць Амэрыкі ў гандлі з СССР не дазволіла гэтаму інцыдэнту вырасьці ў буйны канфлікт.

Амэрыканскія гандлёвыя колы і амэрыканскі эканамічны друк з самага пачатку занялі прыхільную палітыку да нас і, такім чынам, яшчэ раз паказалі, што ў сваіх гандлёвых зносінах з СССР яны непадпарадкуюцца ніякаму ўплыву. Гэты інцыдэнт яшчэ раз паказаў нягрунтоўнасьць тых амэрыканскіх палітыкаў, якія даводзяць, што няпрызнаньне СССР Амэрыкай не перашкаджае разьвіцьцю гандлёвых зносін паміж гэтымі дзьвюма краінамі. Ужо ў часе гэтага інцыдэнту амэрыканскі друк узмацніў кампанію за прызнаньне СССР. Амэрыканскі ўрад гэтага павінен зрабіць належныя вынікі.

Няўдалы напад на савецкае золата.

Такім чынам, савецкае золата, на якое быў ускладзен арышт у зьвязку з пратэстам узьнятым Францускім Дзяржаўным Банкам, варочаецца назад з Амэрыкі ў СССР. Францускі Банк нават не адважыўся ўзьняць судовы працэс і ўнесьці патрэбную суму грошай у заклад за савецкае золата. Францускі Банк на гэта не пайшоў, бо раней ведаў усю бязглузьдзіцу, нягрунтоўнасьць і бяссэнсоўнасьць свайго патрабаваньня.

Амэрыканскія ўрадавыя колы і ў першую чаргу міністэрства фінансаў, якое ў першы час інцыдэнту з нашым золатам спрабавала даказваць свае правы на арышт, прымушаны былі таксама адмовіцца ад сваіх доказаў. Францускі Банк ня мог прывесьці патрэбных доказаў, якія-б пацьвердзілі, што прывезенае ў Амэрыку савецкае золата якраз зьяўляецца тое, што французамі было ў даваенны час унесена ў расейскі Дзяржаўны Банк. Дзяржаўны Банк СССР дакумэнтальна даказаў, што прывезенае золата зьяўляецца савецк й вытворчасьцю і здабыта ўжо пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі і такім чынам Францускі Банк ніякіх адносін да гэтага золата ня мае.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Парадак дню 3-е сесіі ЦВК СССР.

МАСКВА. Адчыненьне 3-е сэсіі ЦВК СССР чацьвертага скліку адбудзецца 11 красавіка а 6 гадзіне ўвечары.

Парадак дню: 1) бюджэт СССР і саюзных рэспублік на 1927-28 г. Даклад СНК СССР—дакладчык БРУХАНАЎ; садаклад бюджэтнае камісіі ЦВК СССР — дакладчык ШМІДТ.

2) Зацьверджаньне справаздачы аб выкананьні адзінага дзяржаўнага бюджэту СССР на 1925-26 г. і выніках рэвізіі выкананьня дзяржаўнага бюджэту за той-жа год. Дакладчык ВАЙНШТЭЙН. 3) Аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку. Дакладчыкі—КАЛІНІН і ФРУМКІН. 4) Пастановы, ухваленыя ў час між сэсіямі, якія падлягаюць на падставе артыкулу 8 Канстытуцыі СССР зацьверджаньню сесіяю ЦВК СССР. Дакладчык ЭНУКІДЗЭ.

Ускрыцьцё цела А. А. Багданава.

МАСКВА, 9-4. 8 красавіка прафэсар Абрыкосаў у прысутнасьці прафэсароў Канчалоўскага, Бурміна, Кранора, і інш. і дактароў інстытуту пераліваньня крыві зрабіў ускрыцьцё цела А. А. Багданава. Ускрыцьцё пацьвердзіла дыягноз, пастаўлены прафэсарам Канчалоўскім у часе хваробы Багданава. Пры ўскрыцьці было выяўлена цяжкае занядужаньне почак і печані, якое выклікана ў выніку распаду чырвоных крыявінкаў. Непасрэднаю прычынаю сьмерці было атручаньне арганізму ядам у выніку глыбокага парушэньня функцый почак, якія зьвы айна выводзяць у працэсе абмену атрутныя матэрыі з арганізму. Лёгкія ў нябожчыка былі зусім здаровымі, і сухотная інфэкцыя ніякага ўплыву не зрабіла. Мазгі Багданава, згодна жаданьню яго жонкі, перададзены ў Інстытут на вывучэньні мазгоў.

9 красавіка ўвесь дзень каля труны нябожчыка стаяла ганаровая варта. Варту несьлі члены Камуністычнае Акадэміі Бухарын, Разанаў, Дзборын, Фрычэ, Пашуканіс, Дволацкі, А. К. Тымірязеў і інш. Увечары рязьбяр Маркулаў зьняў з твару нябожчыка маску.

Заснаваньне Цэнтральна-Чорназёмнае вобласьці.

МАСКВА, 9-4. У зьвязку з пастановаю прэзыдыуму Усерасейскага ЦВК аб аснаваньні Цэнтральна-Чорназёмнае вобласьці, у Крамлі пад старшынсцвам тав. А. С. Кісялёва адбылася нарада членаў Усерасейскага ЦВК, прадстаўнікоў губэрняў, якія ўключаюцца ў склад гэтае вобласьці. Нарада прызнала неабходным скончыць заснаваньне гэтае вобласьці да 1 кастрычніка 1928 г. У склад вобласьці, у якасьці яе асноўнага масыву, уключаюцца наступныя губэрні: **Варонеская, Курская, Арлоўская і Тамбоўская,** *з ліквідацыяй на гэтай мэтэ ворыі губэрняў, паветаў і абласьцёў і пераходам на акруговы і раённы падзел. Цэнтрам Цэнтральна - Чорназёмнае вобласьці нарада вызначыла горад Варонеж.*

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

ЗАБАСТОЎКА НАБОРШЧЫКАЎ У ВІЛЬНІ.

У суботу 31 сакавіка наборшчыкі друкарні Нотэса абвясьцілі забастоўку. Расейская газэтка «Утро», якая друкуецца ў гэтай друкарні, у нядзелю ня выйшла. У панядзелак 2 красавіка адміністрацыя друкарні пайшла на ўступкі, і забастоўка скончылася.

АРЫШТ «КАМУНІСТЫЧНАГА ТЭХНІКА»(?!).

«Дзеньнік Віленскі» (№ 78) паведамляе, што ў сувязі з ліквідацыяй кампартыі Зах. Беларусі ў Наваградзкім ваяводзтве 31 сакавіка адміністрацыя арыштавала ў Баранавічах „тэхніка" КПЗБ, якога пасадзілі ў Наваградзкі вастрог.

Прозьвішча «тэхніка» газэта не падае.

САЮЗ ПОЛЬСКАГА «СЯЛ. САЮЗУ» З «ВЫЗВАЛЕНЬНЕМ».

«Кур. Віл.» паведамляе, што на абшарах Віленшчыны польскі «Сял. Саюз» зьліўся з «Вызваленьнем» і ў далейшым мае намер зьліцца з «Незалежнай сялянскай партыяй».

НАРОД ЧАКАЕ..

На зьезьдзе павятовых земскіх камісараў у Горадні ваявода Кірш запытаў, чаму ў Горадзенскім і Ваўкавыскім павеце «парцэляцыя» адбываецца «стасункова слаба», Рэфэрэнты адказалі, што народ чакае на бясплатную парцэляцыю...

У ВІЛЕНСКІМ БЕЛ. КААПЭРАЦЫЙНЫМ БАНКУ.

2 красавіка г. г. у Вільні адбыўся сход Бел. Каап. Банку. Пасьля справаздачы Ўправы і Нагляднае Рады Банку і прыняцьця абсалютарыуму для Управы і Нагл. Рады былі выбраны сябры Нагл. Рады: гр. гр. Пяткевіч і Кэпель і заступнікі: гр. гр. Грышкевіч, Марцінчык і Міхалевіч.

ПСУЮЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОЛАДЗЬ.

„Дзеньнік Віл." (№ 79) паведамляе, што мэтадысты разгортваюць сярод вучнёўскае моладзі Віленскае Беларускае Гімназіі моцную агітацыю.

ФАЛЬШЫВЫЯ БІЛЕТЫ НА ВІЛЕНСКІХ ЧЫГУНКАХ.

Судовая ўлада выкрыла цэлую хэўру чыгуначных служачых, якія ў працягу трох гадоў выпусьцілі і спрадалі некалькі дзесяткаў тысяч фальшывых білетаў, прычыняючы скарбу дзяржавы некалькі сот тысяч злотых страт. Учынена шмат арыштаў.

«КРАМОЛА» Ў «БЕЛАРУСКАЙ ХАТЦЫ» ПАЎЛЮКЕВІЧА.

Камэндант гарнізону г. Вільні апошнім загадам катэгарычна забараніў вайскоўцам усіх ступеняў бываць у памяшканьні «Беларускай хаткі» д-ра Паўлюкевіча.

УЗРОСТ ДАРАГОЎЛІ.

Паводле статыстычных даных у часе ад 1 да 31 сакавіка г. г. дарагоўля ў Вільні ўзрасла на 3,1 проц

СЬВЕДКІ.

(НА ПРАЦЭСЕ БЕЛАРУСКАЙ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДЫ).

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Доўгай чарадой праходзяць праз залю суду сьведкі. Да гэтага часу ў працягу першых 27 дзен слуханьня справы далі свае паказаньні звыш 200 сьведак. Усяго іх 660.

Да гэтага часу выслухоўваюцца паказаньні сьведак абвінаваўчага боку. Іх можна падзяліць на 3 катэгорыі. У першую катэгорыю ўваходзяць паліцэйскія рознага выгляду зброі і розных ступеняў службовай іерархіі. Гэта ўсё афіцыйныя сьведкі. Другая катэгорыя—тайныя агенты паліцыі і так званыя палітычныя асьведаміцелі—з агульна-чалавечага пункту гледжаньня нізкія асобы, з судовага пункту гледжаньня—матар'ял найніжэйшай якасьці. Неабходна асабліва выдзеліць трэцюю катэгорыю—гэта застрашаныя, не адзін раз бітыя, усімі спосабамі катаваныя людзі, якія судоваму следзтву казалі ўсё, што ад іх патрабавалі і толькі зараз на адкрытым судовым разгляданьні справы адважваюцца адмовіцца ад сваіх першапачатковых паказаньняў.

Першая катэгорыя сьведак не дае паказаньняў і не адказвае на запытаньні—яны робяць заўвагі, яны чытаюць даклады. Трымаюць сябе досыць упэўнена і нахальна. На абарону глядзяць пагардліва, як на магчымых злачынцаў. Сьведка—паліцэйскі камісар Кнаппэ, калі абаронца дае яму «няпрыемнае» запытаньне, адказвае з абурэньнем:

— Я стаміўся і не дазволю, каб платныя агенты саветаў мяне турбавалі...

Красавая паліцыя адчувае сябе ў памяшканьні суду гаспадаром становішча. І апошні нячуваны выпад сьведкі праходзіць беспакаранна.

Тайныя агенты і асьведаміцелі, як зазначана раней, асобы нізкія. Ступень іх грамадзкай і палітычнай няпісьменнасьці вельмі нізкая. Адказы гэтых сьведак на агульна-палітычныя запытаньні зьяўляюцца кампрамэтуючымі для суду і пракуратуры. Старшыні суду нічога іншага не застаецца, як узяць іх пад сваю асабістую апеку. Таму старшыня забараніў адвакатам даваць гэтым сьведкам запытаньні наконт палітпісьменнасьці. Агенты-сьведкі па правілу ўсяк спрабуюць адхіліць сваю прыналежнасьць да охранкі, што ім рэдка ўдаецца. Характэрны выпадак: у працягу гадзіны абарона ўсімі спосабамі спрабуе прымусіць сьведку прызнацца ў тым, што ён служыць у охранцы. Сьведка выкручваецца ўюном. Нарэшце, абодвы бакі стаміліся і падае апошняе запытаньне:

— З якою мэтаю вы записаліся ў камуністычную партыю Заходняй Беларусі?

— Для сьлежкі,—нечакана чуецца адказ.

У залі сьмех. Сьведка ў замяшаньні. Вытрымаў экзамен да канца і спатыкнуўся на самым простым запытаньні.

Шмат сьведак і трэцяй катэгорыі. Усім вядомы мэтады, якія ўжываюцца ў Польшчы наогул і на так званых усходніх акраінах, у прыватнасьці, у часе папярэдняга следзтва. Тут на судзе гэтыя жудасныя малюнкі польскіх засьценкаў выступаюць вельмі яскрава. Большая частка сьведак трэцяй катэгорыі сядзіць у турме, іх прыводзяць у суд узброеныя з ног да галавы лічыя паліцэйскія. Публічныя абставіны суду паддаюць бадзёрасьці нярэдка застрашаным да апошняй ступені людзям. Яны катэгарычна адмаўляюцца ад сваіх ранейшых паказаньняў. Але іх ранейшыя паказаньні, дадзеныя пад прымусам, маюць асабліва вялікае значэньне для абвінавачаньня, таму прокурор і старшыня суду нэрвуюцца. Старшыня ўвесь часъ пытаецца:

— Чаму-ж вы ўсё-ж гаварылі гэта судоваму сьледчаму?

Адказ даецца наступны:

— Білі. Катавалі. Калёнае жалезо. Загналі шпількі пад ногці...

Вось якія сьведкі Вінцэнты Кіслы, Казаковіч, Шаўлюк, Высоцкі, Рыжы і шмат іншых.

Сьведка Шакуль цьвёрда адказвае старшыні на яго запытаньне:

— Ва ўмовах, пры якіх мяне дапытвалі, я мог бы сказаць што хочаце, нават пра свайго роднага бацьку...

Бывала, што арыштаваныя пасьля „допыту" зьвярталіся да доктара за мэдыцынскаю дапамогаю. Адказ астрожнага доктара быў такі, што яго варта запісаць ва ўсе падручнікі мэдыцыны:

— Ня трэба было ўступаць у камуністычную партыю!

Тое самае казаў на судзе адзін з сьведак трэцяй катэгорыі.

* * *

Гэткага працэсу, на якім так багата была паказана охранка, не запамятаюць нават самыя старыя польскія судовыя дзеячы. Абарона абурана. Час ад часу то ў аднаго, то ў другога з абаронцаў вырываюцца насьмешлівыя заўвагі наконт падбору сьведак. Вось ня вытрымаў сівы старац, абаронца Сьмяроўскага, які шмат чаго бачыў у сваім жыцьці:

— Мы выслухоўваем—заяўляе ён—на гэтым працэсе шмат паліцэйскіх дакладаў, якія мы ня можам пракантраляваць. Нельга прымаць на веру ўсё тое, што тут апавядаюць розныя паліцэйскія, якія займаюць розныя службовыя пасады—мы наглядаем тут пэўны баласт сьведак паліцэйскіх...

А паліцэйскія апавядаюць па вывучанаму:

— Рыхтаваліся да паўстаньня. Падаткаў не плацілі. Камэндант паліцыі Карачэвіч апавядае, што ў падпарадкаваным яму райёне былі ўжо сярод грамадаўцаў разьмеркаваны пасады, якія яны павінны былі заняць пасьля паўстаньня... Езьдзілі за інструкцыямі ў Менск. Сьведка Борушко ўяўляе сабе палітычны подкуп вельмі прымітыўна—ён ведае з поўных крыніц, што дэпутаты Грамады атрымлівалі грошы з СССР, якія яны проста разьмяркоўвалі па асобных гурткох... Паліцэйскаму Ментусу грамадаўцы прапанавалі нават заняць пасаду паліцэйскага ў вызваленай Беларускай Рэспубліцы. Ментус, аднак, адмовіўся ад гэтай прапановы. Іншыя паліцэйскія ствараюць л я г е н д у аб нязьлічонай колькасьці зброі, якая была схавана на выпадак паўстаньня. Амаль кожны дзень суд апавядае казку аб вялікіх грошах, якія мела Грамада для палітзьняволеных.

І кожны раз, як пыталіся паліцэйскіх сьведак: адкуль вы гэта ведаеце?

— Службовая тайна, — адказвалі яны.

Калі абарона ставіць запытаньне:

— Калі было столькі зброі, чаму яна ня была знайдзена і канфіскавана?

— Ня ведаю,—адказваў сьведка.

Калі абарона паступова дабіраецца да вялізарнай сумы грошай, прызначанай для палітзьняволеных, аказваецца канкрэтна, што ў тэй ці іншай хаце была знойдзена бульба, сабраная самаабкладаньнем сялян на патрэбы зьняволеных сялян.

Вялізарнай сумы грошай ніяк нельга дашукацца.

Нельга дашукацца і зброі. Нелегальныя арсэналы Заходняй Беларусі прадстаўлены на судзе 2-ма ці 3-ма заржаўленымі вінтоўкамі розных фірм.

* * *

Увесь працэс на 90 процантаў складзен з паказаньняў рэфэрэнтаў охранкі, паліцэйскіх палітычнай паліцыі і раскіданай сетцы іх асьведаміцеляў. Досыць часта інфармацыя перадаецца праз трэція, чацьвертыя рукі. Заместа ясных паказаньняў сьведкаў, часта чуецца ў залі суда: нехта каму-та сказаў, нехта чуў, што нехта на каго-та зрабіў донос.

А калі задаецца пытаньне:

— Менавіта хто?

— Не магу сказаць: служ**бовая тайна

Нядобраякасна складзена абвінавачаньне нават з пункту погляду буржуазнай, судова-юрыдычнай справядлівасьці.

Ёсьць сьведкі, паказаньні якіх запамінаюцца як анэкдот. Хіба паліцэйскі прыстаў, хоць-бы з усходніх акраін, павінен быць псыхолёгам на 100 проц.? Пры тым заробку, які атрымоўвае паліцэйскі, ад яго і так патрабуюць вельмі шмат.

Сьведка—камісар паліцыі Цьвілінскі напаўна выхоўваўся на дрэнных бульварных дэтэктыўных раманах. Ён любіць сэнсацыі з ухілам да таемнасьці. Ён апавядае: у лесе сьведка знайшоў сьпіс нейкай апэратыўнай групы. Сьпіс быў падзелен на графы, прычым у аднэй графе азначалася, якія выгляды зброі маюць асобныя члены апэратыўнай групы.

— Вы затрымалі членаў гэтай баявой групы?—пытаецца абарона.

— Ня ўсіх, былі затрыманы толькі арганізатары групы.

— Адкуль вы ведалі, хто арганізатары?

— Яны падпісаліся пад знойдзеным сьпісам.

— Уласнаручна?

— Так, уласнаручна.

У залі сьмех. Сьведка доўга не дагадваецца яго прычыны.

Рэфэрэнт аддзелу безапаснасьці (палітычная паліцыя) ўрадавага камісара гор. Вільні наступным чынам растлумачвае суду значэньне і пахаджэньне лёзунгаў—тварам да вёскі.

— Савецкая Расея—гаворыць сьведка—пераканалася, што ёй няма чаго спадзявацца на рабочую клясу Захаду. Таму быў кінут лёзунг—тварам да вёскі. У зьвязку з гэтым лёзунгам, па распараджэньню Сялянскага Інтэрнацыяналу, былі арганізаваны ў Польшчы Грамада і незалежная сялянская партыя.

Суд слухае гэты нянісьменны лепет з поўнай сур'ёзнасьцю.

Ранейшы староста ў Слоніме, які выступіў сьведкай на гэтым працэсе, лічыць, што ўсе партыі, як ППС, нават і група Паўлюкевіча працуе на бальшавіцкія грошы.

Паліцэйскі Кашэўскі, які дае паказаньні проці абвінавачанага селяніна Келды, заяўляе, што абвінавачаны вёў інтэнсіўную анты-дзяржаўную дзейнасьць, але, сам не заўважваючы гэтага, гаворыць увесь час аб тым, што абвінавачаны вёў кампанію за адчыненьне беларускіх школ.

Абарона намацвае сьведку:

— Скажэце, а за адабраньне беларускіх зямель ад Польшчы, абвінавачаны агітаваў?

Хвіліна раздум'я. А потым:

— Мусіць да гэтага справа ідзе, калі вядзецца агітацыя за беларускую школу.

Паказаньні гэтага сьведкі надзвычайна характэрны. Ня толькі ў вузкай галаве паліцэйскага Кашэўскага факты прадстаўляюцца так уродліва. Польскія крэсавыя палітыкі больш буйнага маштабу, чым паліцэйскі Кашэўскі, таксама гатовы разглядаць арганізацыю ўсякай беларускай школы, як узброенае паўстаньне, тэатральны гурток, як самае небясьпечнае, злачыннае сакрэтнае гуртаваньне. У акупіраванай краіне ўсякая спроба грамадзкай арганізацыі пагражае ўладзе акупантаў і таму павінна, з паліцэйскага пункту погляду, разглядацца, як спроба бунту.

Вось якія, так званыя. усходнія акраіны. Якія іх кіраўнікі, такія іх і сьведкі, якіх яны могуць выставіць проці беларускага нацыянальнага і сацыяльнага вызваленчага руху.

І вось, на падставе гэткіх паказаньняў сьведкаў, на падставе агіднага абвінаваўчага матар'ялу, польскі клясавы суд, які называе сябе незалежным і справядлівым, зьбіраецца пасадзіць 56 лепшых прадстаўнікоў Заходняй Беларускай грамадзкасьці на 400 год катаржнай турмы.

ЯЗЭП ПАЎЛОЎСКІ.

Варшава, красавік 1928 г.

*) Сьледзтва. **) Дапытваны.

Перад вясеньняй сяўбой.

Кантрактацыя на Аршаншчыне.

Ворша. У Аршанскай акрузе будзе закантрактавана ў вясеньнюю пасяўную кампанію канюшыны 300 гэктараў.

На кантрактацыю канюшыны адпушчана 15.000 руб.

Лёну-валакна будзе закантрактавана на 3.000 гэктарах з таварным выхадам у 6.500 цэнтнэраў лёну-валакна.

На кантрактацыю лёну-валакна адпушчана 81.000 руб.

На кантрактацыю бульбы будзе адпушчана 64.920 руб. Бульбы будзе закантрактавана 1.855 гэктараў з таварным выхадам у 81.620 цэнтнэраў бульбы. **С.**

Не ва ўсім добра.

Па райёну маецца камун і арцеляў 10. Па пляну пасеўкампаніі намечана арганізацыя новых арцеляў і камун. У выкананьне гэтага арганізавана новая арцель з былых хутароў.

Да гэтага часу ачышчана сялянам 4420 пудоў пасеньня. У ачыстцы прымалі ўдзел, галоўным чынам, камуны і арцелі. У пасеўкампаніі камуны і арцелі райёну ўдзельнічаюць дастаткова. Пры кожнай з іх знаходзіцца добра абсталёваны зерноачыстны пункт, які абслугоўвае сялян.

У гэтых адносінах яны могуць быць прыкладам, а ў справе рэалізацыі пазыкі—ні ў якім разе. **П. В—ў.**

Гор. Гарадок, Віцебскай акругі.

Будзе працаваць 7 трактараў.

Полацак, 10-4. Летась па калектыўных гаспадарках Полаччыны працавалі 3 трактары. Сёлета будзе да пасяўной кампаніі завезена яшчэ 4 трактары, з якіх 3 ужо прыбылі на месцы. Такім чынам, сёлета будзе працаваць 7 трактараў, з якіх 5 прыпадае на Валынецкі райён.

Недарэчнасьці ў падрыхтоўцы.

(Ад уласнага карэспандэнта з Гомельшчыны).

Плян і.. сапраўднасьць.

Да складаньня плянаў пасяўной кампаніі ў Гомельшчыне прыступілі ў пачатку красавіка. Асноўныя практычныя пытаньні перад раённымі арганізаціямі паўсталі ў палове сакавіка.

Тут дрэнна тое, што пляны апрацоўваліся бяз удзелу сялянства і падыход да гэтых плянаў быў «прыблізны», які на многа разыходзіцца з сапраўднасьцю.

У Церахаўскім райёне плян прадугледжвае кантрактацыю льнянога насеньня 40 гэктараў, а пры абсьледваньні аказалася, што можна было закантрактаваць 512 гэктараў; лубіну замест 10 гэктараў па пляну—62 з паловаю гэктары ў сапраўднасьці; ячмень піваварны плянам зусім ня быў прадугледжан, а можна было закантрактаваць 52 з паловаю гэктары; бульба па пляну не прадугледжана, а можна было закантрактаваць 380 гэктараў.

Адносіны аграномаў да пытаньняў практычнага правядзеньня дырэктыў партыі і ўраду былі няўважныя.

Плугі ёсьць, але на складах.

Ня гледзячы на тое, што ў БССР на заводах і на складах Белсельсаюзу ляжаць вялікія запасы плугоў, у Церахаўскім райёне плугоў № 0 зусім не аказалася. Старшыня крэдытнага таварыства заяўляе, што плугоў ад Палессаюзу ён ніяк ня мог атрымаць.

Насеньне, мінэральнае ўгнаеньне і с.-гаспадарчыя машыны райён мае поўнасьцю. Усе гэтыя матар'ялы ўжо ляжаць на складах таварыства.

Прасоўваньне-ж яго ў вёску ня толькі за гатоўку, але і ў крэдыт праходзіць надзвычайна слаба, ня гледзячы на тое, што ў гэтым месцы сяўба пачынаецца звычайна шмат раней, чымся ў іншых.

Да 5 красавіка аўса гатунковага прасунута ў вёску 2,5 проц., простага—2 проц., ячменю—3 проц., лёну даўгунцу — 1,75 проц., простага—нічога, вікі—0,36 проц., канюшыны—0,25 проц., цімафейкі—1,1 проц., і толькі лубіну прасунута 17 проц. Гэта даводзіцца тым, што праца пачалася вельмі позна, што цэны на гэтае насеньне аб'яўлены толькі 1 красавіка і што разьмеркаваньне насеньня праходзіла не адначасова з кантрактацыяй.

Каго крэдытуюць.

Летась практыкавалася крэдытаваньне сялянства натураю. Сёлета такая ўстаноўка зьменена. Папулярызацыя на мясцох гэтай зьмены праводзіцца надзвычайна слаба. Селянін-бядняк ня ведае, што ён мае права атрымаць грашовую пазыку без паручыцельства.

Ня гледзячы на тое, што пастанова XV партзьезду і іншыя дырэктывы ясна гавораць аб звальненьні беднякоў ад паручыцельстваў пры атрыманьні пазык для пасяўной кампаніі, сялянства, а нават і некаторыя ўстановы гэтага ня ведаюць. Сяляне падаюць заявы ў крэдытныя таварыствы з просьбаю выдаць ім крэдыт без паручыцельства, ня ведаючы, што яны маюць на гэта права і без заяў.

У Глыбоцкім праўленьні крэдытнага т-ва без паручыцельства крэдыты не выдаюцца. Пры праверцы Гомельскага аддзяленьня акрсельбанку дырэктыў аб звальненьні беднякоў ад паручыцельства зусім не аказалася.

Камітэты ўзаемадапамогі выдаюць спраўкі, якія не адпавядаюць сапраўднасьці. Так, у Насовіцкім крэдытным т-ве селяніну Івану Казлову была дадзена на 6 м-даў пазыка ў 75 р. на пакупку каровы. Аказалася, што Казлоў мае вось якую гаспадарку: 3,5 дзесяціны пашні, 2,5 дзесяціны сенажаці, 1 каня, 2 каровы, 4 будынкі, 25 вульляў пчол, паўдзесяціны ўласнага саду; апроч гэтага, Казлоў—падрадчык, у суполцы з іншымі арандуе 9 дзес. саду і г. д.

Другі выпадак: тое-ж т-ва выдала пазыку ў 150 р. на паўтара гады Андрэю Чуясаву. Пазыка выдана на пакупку дому. Чуясаў на хутары Анціпаўка мае свой уласны дом, на штатнай пасадзе працуе ў чыгуначных майстэрнях, адным словам, мае невялічкую гаспадарку.

Сяляне не заўважылі, як праз вёску прайшоў абоз па ачыстцы зярна.

Ачыстка зярна ў дасьледаваных райёнах Гомельшчыны праведзена на 50 проц. пляну.

Слабы посьпех у правядзеньні ачысткі зярна даводзіцца непадрыхтаванасьцю абозаў і тым, што ачыстка пачата несваячасова. Апроч таго, аграномы мала тлумачылі сялянам, што чысьціць зярно карысна. Некаторыя сяляне кажуць:

— Панясу чысьціць, а ён мне палову насеньня ў мякіну ўгоне.

У Церахаўцы быў нават выпадак, што абоз прайшоў праз вёску, а сяляне яго і ня бачылі.

Плян прадугледжвае арганізацыю шэрагу калектыўных гаспадарак, аднак у Церахаўскім райёне ніякіх крокаў да ажыцьцяўленьня пляну ня зроблена. Пазыкі на гэту справу не выкарыстоўваюцца. **Я. Церахавец.**

Як выглядае бесстаронная справаздача аб працэсе Грамады.

Мы ўжо не адзін раз пісалі, што нават некаторыя польскія газэты (Кур'ер Віл.) адзначаюць, што амаль ні ўся польская прэса зьмяшчае тэндэнцыйныя і пры гэтым прасякнутыя дзікім шавінізмам і палітычнай нянавісьцю справаздачы аб ходзе працэсу Грамады.

Мы знарок тут прыводзім тэкст справаздачы аб 14-м дні працэсу Грамады, зьмешчаны ў віленскай аднаднёўцы «Красавік» за 5 красавіка г. г. Польскія газэты зусім прамаўчалі аб гэтым цікавым моманце. Хоць і са спазьненьнем мы перадрукоўваем памянёную справаздачу.

14 дзень працэсу з дню 21 сакавіка 1928 г.

Паказаньні свае ў гэты дзень складаюць першымі былыя грамадаўцы (першыя 6 чалавек), якія цяпер сядзяць у вастрозе (арт. 102 Код. Карн).

Сьв. Шакуль Мікалай уваходзіць з высока падчнятай галавой, а за ім крок у крок наступае паліцыянт са штыхом, наложаным на вінтоўку. Кланяецца былым паслам і ўсім абвінавачаным. Выяўляе сьмела, што ён уступіў у Грамаду дзеля таго, што «гэта партыя найбольш адпавядала маім перакананьням». Да КПЗБ—кажа—не належаў, а калі так сказаў у сьледавацеля, то толькі таму, «што ён мне сказаў, што Грамада і КПЗБ—гэта тое самае, то я падпісаўся на пратаколе». З другога боку паказвае, што яго «катавалі» некалькі разоў на пастарунку паліцыі ў Валожыне, «білі прутамі і палкамі» ў экспазытуры. Таксама было «dochodzenie»*) і ў вастрозе, пры якім «мне разьбілі палкай вусны, на што я маю сьведак».

Сьв. Трус Ян, былы грам., сядзіць у вастрозе (са 102 арт. К. К.), пры ўваходзе ў залю кланяецца толькі абвінавачаным паслам. Паказаньні яго на судзе і ў сьледавацеля нязгодныя. Тлумачыць ён гэта тым, што быў ён «баданы»**) разы 4 у Валожыне, у Вялейцы—разы 3, дзе і «білі» яго, «дзеля чаго і мусіў сказаць тое, што яны хацелі». Сходкі ў гуртках адбываліся, але на іх заўсёды знаходзілася паліцыя.

Атрымоўвалі яны таксама і беларускія газэты, як «Наша Справа», «Крыніца», але не дарма, бо выпісвалі іх паасобныя сябры, месячная выпіска іх каштавала $1^1/_2$ зл.

Сьв. Рыжы Аляксандр, былы грамадавец, цяпер сядзіць у вастрозе са 102 арт. К. К. зазначае, што быў ён сэкратаром Валожынскага гуртка і «стаяў у абароне працоўных». У Цэнтр. Сэкр. у Вільні быў ён толькі 2 разы. За сэкратарства атрымоўваў ён 75 зл. у месяц са складак сяброўскіх, бо толькі 25 проц. усіх грошай адсылалася ў Цэнтр. Сэкр. у Вільню. Былі зьбіраны ахвяры на вязьняў грамадаўцаў, якія былі пасаджаны адміністрацыйным парадкам. Гаворыць далей, што ўсе сходкі, якія рабіліся гурткамі, былі легальнымі, бо мелі дазвол ад старасты і была заўсёды прысутнай паліцыя. Сходак павятовых ня было, але быў ён 2 разы ў Вільні на зьезьдзе.

Адв. Пятрусевіч.—Ці быў на сходцы Астроўскі (у Вільні).

Сьв.—Так, гаварыў аб школьніцтве, каб дамагаліся сваіх школаў і які пры гэтым трэба парадак.

Прак. Раўзэ.—Колькі атрымоўвал іншыя прэзыдыуму гуртка?

Сьв.—Старшыня 40 зл. і скарбнік 20 зл.

Старшыня суду.—Якія функцыі былі павятовага камітэту?

Сьв.—Езьдзілі па гуртках і тлумачылі праграму Б.С.-Р. Грамады.

Судзьдзя Барэйка.—Ці было ў праграме «стварыць самастойную Беларусь»?

Сьв.—Так. Але шляхам эвалюцыі, шляхам арганізацыі.

Пас. Тарашкевіч.—Ці вы думалі аб незалежнасьці, што яна прыдзе адразу?

Сьведка.—Не, што яна будзе з часам.

Далей гаворыць ён, што сяброўскія складкі былі дабравольныя, але кожны мусіў плаціць столькі, колькі ён падпісаў у дэкларацыі.

Сьв. Сабілла Андрэй.—Уваходзячы, кланяецца падсудным (сядзіць у вастрозе са 102 арт. К.К.), ведае Сідаровіча, які арганізаваў гурткі. «Бадалі» яго ў вялейскім астрозе,—па яго словах—7 разоў і «гаварыў так, як паліцыя хацела, бо білі".

Сьв. Ліс Ян (з вастр., арт. 102 К.К.). Уступіў у Грамаду ў 1926 г. па ўласнай ахвоце і, запытаўшыся Салагуба ў Залесьсі, як трэба арганізаваць гурткі, працаваў у гэтым кірунку. Паміж паказаньнямі цяперашнімі і ў сьледавацеля выяўляецца супярэчнасьць. Тлумачыць ён гэта тым, што быў баданы у вялейскім вастрозе ў экспазытуры вельмі многа разоў, дзе за кожным разам гаварылі яму, як ён павінен гаварыць,—баданы ў сьледавацеля, ня ведаў, што гэта судзьдзя, і гаварыў тое, што яму сказалі ў экспазытуры, „бо там білі".

Вось як выглядае справаздача, калі яе даюць бесстаронна.

Барацьба са шкоднікамі.

Вывучэньне шкоднікаў.

Беларускі Дасьледчы Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі сёлета праводзіць вывучэньне ўсіх відаў шкоднікаў, якія шкодзяць садам, гародам, палявым культурам і інш. Дзеля гэтай мэты в Ленінграду і Масквы запрошаны 5 выдатных спэцыялістаў. Вывучэньне шкоднікаў будзе праводзіцца ў дзьвюх паўночных акругах (Віцебскай і Полацкай) і дзьвюх паўднёвых (Гомельскай і Мазырскай).

Прыцягненьне сялян да барацьбы з сажай.

Сёлета намечана плянава праводзіць барацьбу з грыбком сажы, які пашыран сярод збожжа, як ячмень, авёс і пшаніца-ярушка. На час пратручваньня насеньня фармалінам у кожнай акрузе будуць працаваць спэцыяльныя тэхнікі. Дзеля ўцягненьня ў гэту кампанію самога сялянства ў Капыльскім і Грэскім райёнах па пратручваньні насеньня будуць працаваць 10 сялян, якія сёлета закончылі спэцыяльныя сельска-гаспадарчыя курсы.

Дагляд за садамі.

Зараз пачынаюць працаваць у 5 акругах БССР (Менскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Бабруйскай) 17 абозаў, якія будуць нішчыць садовых шкоднікаў, абрэзаць гальлё, ачышчаць кару і наогул праводзіць усю работу на дагляду садоў. Абозы будуць працаваць, галоўным чынам, у сялянскіх садох. Работа па дагляду за садамі будзе праводзіцца гняздавая, у асабліва багатых садамі, райёнах.

Дзеля вывучэньня эфэктыўнасьці гэтай работы абозы будуць працаваць у садох працягу ўсяго сэзону, г. з. у адным месцы будуць праводзіцца ўсе мерапрыёмствы па барацьбе са шкоднікамі, паляпшэньні глебы і інш. работы па дагляду садоў.

Ачыстка насеньня праходзіць нездавальняюча.

Кампанія ачысткі насеньня да апошняга часу праходзе слаба. Першае месца па ачыстцы насеньня займае Магілёўская акруга, апошняе месца—Бабруйская.

Па паасобных акругах да 1 красавіка ачышчана: у Менскай акрузе—36 проц. заданьня, у Бабруйскай—15,3 проц., у Мазырскай—41,8 проц., у Віцебскай—22,5 проц., у Полацкай—36,5 проц., у Аршанскай—29,3 проц., у Магілёўскай—82,4 проц. і ў Гомельскай—59,8 проц. У сярэднім па БССР ачышчана 35,6 проц.

Пытаньні дыскусіі ў КПЗУ.

Пяты сусьветны кангрэс Камуністычнага інтэрнацыяналу так характарызаваў значэньне нацыянальнага пытаньня для сярэдняй Эўропы і Балканаў:

«Барацьба прыгнечаных народнасьцяў проці нацыянальнага прыгнечаньня робіцца разам з тым барацьбою проці ўлады перамогшай у вайне імпэрыялістычнай буржуазеі... Значэньне гэтай барацьбы проці нацыянальнага прыгнечаньня ашчэ павялічваецца тым, што прыгнечваемыя Польшчай, Чэхаславакіяй, Югаславіяй, Румыніяй, Грэцыяй нацыянальнасьці па сваім складзе зьяўляюцца пераважна сялянскімі, і барацьба за іх нацыянальнае вызваленьне зьяўляецца адначасна барацьбою сялянскіх мас проці і нацыянальных памешчыкаў і капіталістаў».

Сярод гэтых праблем «украінскае пытаньне зьяўляецца адным з галоўных нацыянальных пытаньняў Сярэдняй Эўропы, вырашэньне якога дыктуецца інтарэсамі пралетарскай рэвалюцыі, як у Польшчы, Румыніі і Чэхаславакіі, так і ва ўсіх прылежных краёх».

Гэтая характарыстыка ня толькі ня страціла свайго пернаступовага рэвалюцыйна-баявога значэньня; наадварот, яна вымагае ад кампартыі, і ў першую чаргу ад КП Польшчы, КП Заходняй Украіны і КП(б)У найбольшай увагі і правільнага ленінскага вырашэньня украінскай нацыянальнай праблемы.

* * *

Міжнародны імпэрыялізм пад кіраўніцтвам ангельскіх капіталістаў арганізуе крастовы паход проці СССР. Для выкананьня гэтай задачы імпэрыялізм зрабіў стаўку на фашысцкую Польшчу. Польскі фашызм узмоцнена рыхтуецца да вайны проці СССР і арганізоўвае, у першую чаргу, сілы для ўдару па Савецкай Украіне. Для гэтага яму неабходна забясьпечыць свой тыл і наладзіць поўны кантакт і змову з украінскай буржуазеяй. Гэтай змове ў даны момант спрыяе часовая частковая палітычная і гаспадарчая стабілізацыя Польшчы.

Пасьля разгрому украінскага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху проці польскіх памешчыкаў у 1919 г., заходняя-украінская буржуазея спачатку ашчэ ішла за нацыянальна-рэвалюцыйным рухам працоўных мас Заходняй Украіны і нават памыкалася кіраваць ім. Аднак, пасьля канчатковага захопу Заходняй Украіны Польшчаю, заходняя-украінская буржуазея паступова адыходзіць ад рэвалюцыйнай барацьбы і пераходзіць на глебу легальнай апазіцыі да польскай дзяржаўнай улады.

Адначасна ў эканамічнай, сацыяльнай і нацыянальна-рэвалюцыйнай барацьбе працоўных мас Заходняй Украіны ўсё большую і большую ролю пачынае адыгрываць рабочая кляса пад кіраўніцтвам кампартыі, якая за апошні час стала сапраўдным правадыром гэтага руху.

Аб'ядненьне мас, дыфэрэнцыяцыя вёскі, нацыянальнае прыгнечаньне—усё гэта за апошнія гады стала магутным рычагом арганізацыі украінскіх народных мас пад кіраўніцтвам пралетарыяту і кампартыі і прыводзіла да далейшага абвостраньня барацьбы між пралетарыятам, бяднейшым сялянствам і часткаю сярэдняга сялянства Заходняй Украіны з аднаго боку, і польскай буржуазеяй і памешчыкамі—з другога. Гэта-ж штурхала украінскую буржуазею, кулацтва і іх палітычныя партыі на пераход ад апазіцыі да згоды з польскай буржуазеяй і памешчыкамі.

Рост украінскай буржуазеі, абвостраньне клясавай барацьбы на Заходняй Украіне штурхала украінскую буржуазею да агрэсыўных дзеяньняў проці УССР. Для прыкрыцьця гэтых камбінацый яна выкінула лёзунг усеўкраінства, г. зн. аб'яднаньня ўсіх украінскіх земляў у самастойную украінскую буржуазную дзяржаву. Аднак, такую праграму украінская буржуазея спадзяецца ажыцьцёвіць праз поўную перадачу Заходняй Украіны пад уладу панскай Польшчы, праз палёнізацыю яе і праз пераробу усёй Украіны ў калёнію для міжнароднага капіталу пад абсацам польскага фашызму. Такім парадкам, на справе «усеўкраінства» прыводзіць да прыгнечаньня ўсяго працоўнага украінскага народу пад уладаю украінскай буржуазеі, польскага і міжнароднага фашызму.

Гэты палітычны пералом у поглядах украінскай нацыяльнай буржуазеі быў занатаваны ў пастановах такой палітычнай арганізацыі, як УНДА (украінскае нацыянальна-дэмакратычнае аб'яднаньне), якая стала на шлях украінскага ваяўнічага нацыяналізму проці СССР.

Адною з найбольш сур'ёзных прычын пераходу украінскай буржуазеі на бок польскага фашызму была страта веры ў буржуазнае перараджэньне Савецкай Украіны. Гаспадарчы і культурны рост Савецкай Украіны, кансалідацыя сіл СССР штурхалі украінскую буржуазею, якая страціла грунт сярод шырокіх рабоча-сялянскіх мас Заходняй Украіны, на шлях шуканьня дапамогі польскага фашызму. Частковая гаспадарчая і палітычная стабілізацыя Польшчы, яе шуканьні рынкаў, імкненьне выйсьці да Чорнага мора і аднавіць межы 1772 году,—што магчыма толькі ў выніку інтэрвэнцыі,—павялічвае ролю і значэньне украінскай буржуазеі для польскага фашызму як у падрыхтоўцы гэтай інтэрвэнцыі, так і ў момант вайны з Савецкім Саюзам.

Сьледам за украінскай буржуазеяй ідзе верхавінная частка украінскай дробнай буржуазеі, якая мае некія надзеі наконт магчымасьці здаволіць свае патрэбы ў межах польскай буржуазнай дзяржаўнасьці.

Гэтыя працэсы пераарыэнтыроўкі сярод украінскай буржуазеі былі паскораны актыўнай палітыкай польскага фашызму з моманту апошняга перавароту Пілсудзкага. Шэраг уступак з боку польскага фашызму украінскай буржуазеі, бачнасьць зьмены ў бок паленшаньня нацыянальнай палітыкі на Заходняй Украіне, парцэляцыя і камасацыя, фінансавае падтрыманьне украінскай буржуазеі і кулацтва, заляцаньне да украінскай дробнай буржуазеі,—усё гэта ўзмацняе змову польскага фашызму з украінскай буржуазеяй проці рабочых і сялян Заходняй і Савецкай Украіны.

Зразумела, што на даным гістарычным этапе імкненьні польскай і украінскай буржуазеі супадаюць. Аднак выразна відаць, што палітыка польскага фашызму вядзе да таго, каб, выкарыстаўшы розныя формы украінскіх нацыянальна-буржуазных арганізацый, падначаліць увесь гэты рух сваім інтарэсам. Унутры краю польскі фашызм імкнецца разьбіць, разваліць, выбухнуць знутры ўсе рэвалюцыйныя арганізацыі рабочых і сялян, выкарыстаўшы дзеля гэтага падкупленую украінскую буржуазею і яе палітычныя арганізацыі.

Украінская буржуазея пры абвостраньні незамірнай сацыяльнай барацьбы з рабочымі і сялянамі Заходняй Украіны, імкнучыся пашырыць сваю эксплёататарскую працу ў абхвацe «усеўкраінства», страціўшы веру ў буржуазнае перараджэньне Савецкай Украіны пры наліччы культурнага і гаспадарчага росту ўсіх народаў СССР,—стала на шлях ваяўнічага украінскага фашызму ў саюзе з фашысцкай Польшчай проці рабочых і сялян Украіны і Польшчы.

* * *

Польскі фашызм, ідучы на змову з украінскім нацыяналістычна-пятлюраўскім лягерам, ня толькі не паслабляе эканамічнага, палітычнага і нацыянальнага прыгнечаньня ў адносінах шырокіх працоўных мас украінскага народу, але пры дапамозе гэтага лягеру яшчэ больш павялічвае гэтае прыгнечаньне, ужываючы сыстэму голага тэрору і шэрагу складаных манэўраў, накіраваных да разьвалу і дэмаралізацыі сіл пралетарыяту. У першую чаргу яго ўдары накіраваны проці кампартыі і шырокіх рабоча-сялянскіх мас Заходняй Украіны і іх арганізацый. Адна з найбольш вострых зброй польскага імпэрыялізму, якія ўжываюцца, каб разваліць і дэмаралізаваць рабоча-сялянскія масы Заходняй Украіны,—паклёп, інсінуацыі проці Савецкай Украіны, яе нацыянальнай палітыкі і культурна-гаспадарчага будаўніцтва. Сярод шырокіх мас ён спрабуе стварыць ложнае ўяўленьне аб будаўніцтве сацыялістычнай Украіны. Ён імкнецца пераканаць масы, што Савецкай Украіны, як дзяржавы, няма, што ёсьць Маларосія, поўдзень Расеі пад абсацам вялікадзяржаўнай Масквы, і што ўсе гавэнды аб будаўніцтве Савецкай Украіны, яе культурных і гаспадарчых дасягненьнях—мана. Сапраўднае-ж вызваленьне і росквіт украінскі народ перажыве, па іх думцы, толькі ў барацьбе проці Масквы, у шчыльным саюзе з буржуазна-фашысцкай Польшчай Пілсудзкага. Адначасна польскі фашызм агнём і мячом зьнішчае і падрывае сілы украінскага пралетарыяту і сялянства (Уладзіміра-валынскі працэс 151 украінскіх рабочых і сялян, расстрэл рабочых і сялян у Стрыі, Надвірнай, Дзьвінячы, Луцкі працэс 73). Усё гэта—падрыхтоўка да будучага наступу на СССР. Такім парадкам, на Заходняй Украіне ід

Вакол кампаніі „Дню Лесу“ трэба згуртаваць грамадзкую ўвагу.

(Гутарка з інспэктарам па лесакультурах т. Івановым).

Усім вядома, якое вялікае значэньне адыгрывае лес у жыцьці чалавека, сабліва ў жыцьці селяніна. Апрача аго, што лес дае ўсе патрэбныя ма-ар'яны для будаўніцтва, апалу, розныя прадукты, як смала, вугаль, лыа, шпігінар і інш., лес затрымлівае ятучыя пяскі, сьцішае гураганы і вялікія вятры, захоўвае вільгаць для эк і г. д.

Вось чаму абавязак кожнага сьвяомага грамадзяніна ня толькі ахоўваць лес, а і дапамагаць лесаадноўленьню, засеву і пасадцы дрэў, дзеля кой мэты кожны год і праводзіцца ампанія «Дню Лесу». У часе гэтай ампаніі Цэнтральная Камісія па праядзеньні „Дню Лесу“ намецілa значную работу па пасеву і пасадцы лесу, закладцы лясных гадавальнікаў, ачысты лесу ад ламачча і г. д. Поруч з этым намечана наладзіць шэраг лекый і гутарак аб тым, як трэба каыстацца лесам, як яго ляпей ахоўваць, аднаўляць і разводзіць. Гэткім ынам, насельніцтва практычна і тэаэтычна атрымае веды аб даглядзе і днаўленьні лесу.

У надыходзячую кампанію мы наецілі правесьці каля 1500 гутарак і экцый; праэктуецца засадзіць ва ўсім бшары БССР да 260 і засеяць да 11 гэкт. лесу; арганізаваць гадавальікі на пляцы каля 5 гэкт.; абсадзіць уліцы і дарогі на 216 кіл.; пасадзіць каля сядзіб, хат, школ і інш. аля 36600 дрэў; ачысьціць ад лачча і гальля 3550 гэкт. і зрабіць бгарожу вакол высечак і маладняку на працягу 544 клм Бязумоўна, гэта кампанія адыгрывае вялікую ролю ў справе палепшаньня становішча лесу і аднаўленьня лясоў мясцовага значэньня; уся гэта праца будзе праводзіцца пад кіраўніцтвам лясьнічых і лясных спэцыялістаў.

Мы ўпэўнены, што гэта кампанія, па прыкладу леташняга году, дасьць добрыя вынікі. Летась у часе кампаніі «Дню Лесу» было засеяна 109 гэкт. лесу, засаджана—285 гэкт.; закладзены лясныя гадавальнікі на пляцы ў 12342 кв. мэтр.; закладзены паркі на пляцы ў 44922 кв. мэтр.; падрыхтавана глеба пад пасеў і пасадку лесу на пляцы ў 106 гэкт.; ачышчана 2991 гэктар лесу; высаджана 136 клм прысадаў і пасаджана каля хат, сядзіб і інш. 62170 дрэў і інш.

Уся гэта значная праца па лесаадноўленьні, праведзеная пры ўдзеле шырокіх колаў працоўных, сьведчыць аб тым, што працоўныя масы, асабліва наша моладзь, добра зразумелі задачы штучнага лесаадноўленьня.

Чым больш у гэтай кампаніі будзе ўдзельнікаў, тым больш яна дасьць вынікаў, і тым больш будзе сьвядомых у лясной гаспадарцы асоб, што асабліва важна для тых грамадзян, якія карыстаюцца лясамі мясцовага значэньня.

Дык няхай-жа кожны грамадзянін і асабліва чулая і спрыяючая ўсялякай жывой справе наша моладзь прыме актыўны ўдзел у правядзеньні «Дню Лесу»—у гэтым вельмі карысным сьвяце аднаўленьня лесу.

Трэба даць магчымасьць аграному працаваць.

Сельска-гаспадарчая кампанія, пачынаючы з вясеньняй сяўбы, павінна ць пачатак практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў XV зьезду УсеКП(б) кант больш пасьпяховага разьвіцьця творчых сіл сельскай гаспадаркі—шырэньне сацыялістычных элемэнтаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці базе вытворчага каапэраваньня і лектывізацыі. Перад аграпунктамі, у паведнасьці з запатрабаваньнямі кожга райёну, паўстаюць задачы ўзмацненьня вытворчага каапэраваньня, рганізацыі буйных калектыўных гаспадарак, больш актыўнага разгортваньня мерапрыёмстваў па ўздыму ўраайчасьці, па развою таварнасьці льскай гаспадаркі, па ўвядзеньню вай агрыкультурнай тэхнікі, па пашыраньню сувязі паміж каапэрацыяй, эдытам, землеўпарадкаваньнем і саейнічаньне сувязі каапэраваных выорцаў сыравіны з дзяржаўнай прамысловасьцю.

У сучасных умовах забясьпечаны лікія магчымасьці выяўленьня ролі эцыялістаў у справе перабудовы льскай гаспадаркі на больш высокай хнічнай базе, і гэта ўжо адно павінн выклікаць вялікую актыўнасьць ырокіх мас спэцыялістаў.

Акруговая канфэрэнцыі спэцыялістаў, якія нядаўна адбываліся па ўсёй ССР, аднагалосна прывіталі пастано XV зьезду па ператварэньні дробх сялянскіх гаспадарак у буйныя лектывы. Ажыцьцяўляючы каапэраыны плян Леніна, мы зможам мець альныя вынікі рацыяналізацыі сельспадарчай вытворчасьці—больш пасьіховы пераход на машынную тэхніку,—павялічэньне ўраджайнасьці, пашыраньне дабрабыту бядняцка-серадцкіх мас вёскі,—будзем мець станоўя вынікі працы савецкай арганаміі. і як тэхнік, ня як кансультант, а арганізатар абагуленых сацыялістычных форм сельска-гаспадарчай вытворчасьці павінен падыйсьці аграном да справы практычнага выкананьня задач, вызначаных партыяй і ўрадам, і такім чынам ён нямінуча робіцца ўдзельнікам клясавай барацьбы на вёсцы, абапіраючыся на савецкую грамадзкасьць і ў першую чаргу на сельска-гаспадарчы пралетарыят і беднату.

Выкананьне гэтай адказнай ролі спэцыялістаў патрабуе ўмоў максымальна-вытворчай працы,—стабілізацыі для больш працяглай працы на адным месцы, канцэнтрацыі працы спэцыялістаў на асноўных задачах кампаніі і ўсямернай дапамогі ў гэтым. Да гэтага часу, ня гледзячы на пастановы лютаўскага пленуму ЦК КП(б)Б і на пастановы СНК БССР ад 15-Ш г. г. аб паленшаньні матар'яльна-бытавых умоў працы райённых спэцыялістаў і ранейшых дырэктыў, мы ня маем яшчэ поўнага ажыцьцяўленьня практычных мерапрыёмстваў накіраваных да гэтага.

Досыць адзначыць, што яшчэ да гэтага часу ня скончана падпісаньне калектыўных дагавораў на аграпрацаўнікоў райёнаў, не забясьпечаны аграпрацаўнікі кватэрамі (ці сродкамі для найму іх), шмат у якіх райёнах аграномы будуць абслугоўваць пасеўную кампанію на „ўласнай пары“, немэтазгодна скарыстоўваюцца на неспэцыяльнай і нязьвязанай з грамадзкай дзейнасьцю спэцыялістаў працы, несваячасова забясьпечваюцца асыгнаваньнямі на мерапрыёмствы, прадугледжаныя плянамі агранамічнай працы. Каб зразумець усю вострасьць гэтых запатрабаванняў, трэба зараз-жа, сёньня, да выхаду ў поле, выканаць пастановы ўраду на складаньню максымальна вытворчых умоў працы і па садзейнічаньню канцэнтрацыі ўвагі спэцыялістаў на асноўных зьвеньнях, за якія магчыма цягнуць увесь ланцуг сельска-гаспадарчай вытворчасьці да сацыялістычнага земляробства.

Т. А.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Арганізавалі малочнае таварыства.

Старыя-Дарогі, 9-4. У вёсцы Дражна, Стара-Дароскага райёну арганізавана малочнае т-ва. Яно ахоплівае вёскі: Дражна, Залужжа, Падарэсьсе і Жыцінскія хутары. Пры ўмове, калі будзе зладзена 10 проц. малака ад усіх кароў першых двух вёсак, то перапрацоўка дасягне 256 тон малака, альбо звыш 11,2 тоны масла.

Сельсаюзам адпушчан т-ву крэдыт у 2500 руб. на набыцьцё інвэнтару і закупку малака. Таксама сельсаюз забясьпечыў водпуск 4 тон макухі і столькі-ж вотрубей. Т-вам ужо пабудавана лядоўня і маюцца на месцы машыны.

КРЭДЫТ НА БУДАЎНІЦТВА.

ГОМЕЛЬ, 10-4. У бягучым годзе рабочы банк асыгнуе 515 тысяч руб. на догўатэрміновае цалявое крэдытаваньне. На жыльлёвае будаўніцтва будзе асыгнавана 230 тысяч руб., на абсталяваньне і пашырэньне электрастанцыі і вадаправоду 185 шысяч руб., на пабудову хлеба-заводу—50 тысяч руб., на пашырэньне выпечкі хлеба ў акрузе—20 тысяч руб., на пашырэньне цагельнага заводу—35 тысяч руб.

ПЕРАД НАВІГАЦЫЯЙ.

ГОМЕЛЬ, 10-4. 9 красавіка на рацэ Сож пачаўся ледаход. Праз 2 дні пачнецца навігацыя.

ЛЕДАХОД НА ДЗЬВІНЕ.

Віцебск, 9-4. Узровень вады ў Дзьвіне павышаецца. Вадамерная рэйка паказвае каля 6 мэтраў вышэй ардынара. У нарошыстых мясцох—у Барвіне, Слабадзе, Рубе і інш. вышэй Віцебску за 10-18 вёрст, рака вусім ачысьцілася ад лёду. Да 10-12 красавіка чакаецца спыненьне ледаходу і адкрыцьце параходнага руху. Сплаў лесу пачнецца крыху пазьней.

НОВЫ МАЛОЧНЫ ЗАВОД.

Самахвалавічы, 10-4. У вёсцы Пяцеўшчына, Самахвалавіцкага райёну, у хуткім часе пачне буцавацца новы малочны завод. Гэты завод абсталёўваецца замежнымі машынамі і ў дзень будзе перапрацоўваць 5000 літраў малака.

ПАРА РАСКАЧАЦЦА.

(Рагачэўскі райён, Бабруйшчына).

Рэалізацыя пазыкі, у апошнія тыдні затрыманая з прычыны таго, што сельсаветы ня вявялі патрэбнай увагі гэтай важнай справе, і заданьне да 1 красавіка выканана толькі на 64 проц.

ПРЫКЛАДАМ МОЖА СЛУЖЫЦЬ АЗЯРАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ, які выканаў заданьне ў тэрмін на 100 з лішнім процантаў (рэалізаваў 3600 руб.), ва ім ідуць ГАРАДЗЕЦКІ—80 проц. і ВЫШАНСКІ, а рэшта выканалі толькі палову заданьня. За нядбайныя адносіны да рэалізацыі пазыкі ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ СТАРШЫНЯ СТАЎПЯНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ І СЭКРАТАР ЦІХІНІЦКАГА С.-С.

Недахопам у рэалізацыі трэба лічыць недастатковае кіраваньне субагэнтамі.

Я.

ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАЛІ НА 150 проц.

Ворша, 10-4. Аршанскаму ЦРК было дадзена заданьне сабраць 9000 руб. паявога капіталу.

Заданьне выканана сваячасова з перавышэньнем. На 1 красавіка паявы капітал узрос з 18034 руб. да 35000 руб. Заданьне выканана на 150 проц.

Зараз ЦРК дадзена яшчэ заданьне на другую палову 1927-28 г. сабраць яшчэ 25000 руб., і гэта заданьне будзе выканана.

Самаабкладаньне на дабрабыт вёскі.

Будзем з новай школай.

Нядоўга гутарылі на сходзе сяляне вёскі Ляжнёўкі, калі абгаварвалася пытаньне аб самаабкладаньні.

— Сродкі, куды? На школу?

— Ну, дык няма чаго і гаварыць...

Адзінадушна пастанавілі правесьці самаабкладаньне ў разьмеры 32 проц. ад сумы дадатку, што дасьць 700 руб.

За гэтыя грошы сяляне вырашылі пабудаваць у сваёй вёсцы будынак для школы.

Не разыйшлося ў ляжнёўцаў слова з справай,—з дапамогаю райвыканкому набылі ў 30 вёрстах ад Ляжнёўкі вялікую хату і не пасьмелі аглянуцца, як гэтая хата ўжо перавезена.

— Зьбярэм грошы і адбудуем школу за які небудзь месяц, а з новага вучэбнага году нашыя дзеці будуць у новай цёплай школе.

— Вось будзе добра,—нават чырвоны куток у сябе адчынім, запрацуе ліквпункт:—разважаюць сяляне в. Ляжнёўка. **Дзядзька Сам.**

В. Ляжнёўка, Магілеўскага р.

7.000 Р. НА ДАБРАБЫТ МЯСТЭЧКА.

Насельніцтва м-чка Смалявічы на агульных сходах пастанавіла: правесьці самаабкладаньне ў разьмеры 35 проц. ад падатку.

На брукоўку Чарніцкай і Магільнай вуліц—2.500 руб., рамонт лазьні—500 р., пабудову пажарнага дэпо—1.600 руб.і пабудову II канцэнтру яўрэйскай сямігодкі 2.500 руб., а ўсяго на суму 7.000 руб. Апрача таго, насельніцтва абавязалася даць рабочую і гужавую сілу па дастаўцы каменьня і пяску на брукоўку вуліц і лесаматар'ялу на пабудову пажарнага дэпо.

Насельніцтва Кляніцкага і Варатоўскага с.-с. на агульных сходах пастанавіла: дапамагчы смалявічанам у брукоўцы вуліц дастаўкаю бясплатна па два разы кожным селянінам каменьня. У дастаўцы каменьня і пабудове пажарнага дэпо прыме ўдзел усё насельніцтва Смалявіч.

Адмовіўся ад дастаўкі каменьня адзін толькі Верхменскі с.-с. Як відаць, гэта пытаньне слаба было падрыхтавана с.-с. Ёсьць упэўненасьць, што калі пачнецца праца па брукоўцы вуліц, то і насельніцтва Верхменскага с.-с. не адстане ад сваіх суседзяў Варатоўскага і Кляніцкага с.-с. і прыме ўдзел у агульнай справе, бо і яму напэўна надаела ўжо купацца ў смалявіцкай гразі.

Так агульнымі сіламі і сродкамі палепшаецца дабрабыт нашага м-чка.

Хадыка.

м. Смалявічы, Меншчына.

„МЭТАДЫ“ КУЛАКОЎ.

З самага пачатку кампаніі па самаабкладаньні прышлося сустрэць правы супярэчнасьці з боку заможнага насельніцтва.

У м. Лагойску кулак Камоцкі ніколі не хадзіў на сходы, а на сход па пытаньні аб самаабкладаньні першы прышоў.

Заможнік Шульговіч першы выступіў супроць самаабкладаньня, а яго падтрымаў «свой», і той, хто быў ад беднаты, не адважыўся выступаць і сказаць супроць заможніка-суседа.

У в. Таранава два разы зьбіралі сход беднаты і аболвы разы на сходы прыходзілі ўсе заможнікі, а бедната ня ўся была апавешчана.

У некаторых мясцох бедната не зразумела сваёй клясавай моцы і не разумее клясавага падыходу да справы. Прыклад: у в. Церахавічы да выданьня дэкрэту аб самаабкладаньні было па ініцыятыве саміх грамадзян пастаноўлена сабраць па 2 руб. з двара на школу. Калі цяпер ім сталі талкаваць, што так нельга, а трэба разлажыць па моцнасьці гаспадаркі, яны катэгарычна паўсталі супроць і заявілі: як пастанавілі, няхай так і будзе.

У в. Пагрэбішча заможнік выйшаў і кажа:

— Мы падатак за ўсіх плацім і гэтыя грошы (па самаабкладаньні) зложым гэтым гультаям (г. зн. беднаце).

Усюды кулакі, дзе самі, а дзе праз сваіх «намоцнікаў» у выпадку, калі на сходы іх не бярэ, стараюцца правесьці ў самаабкладаньне папытку «ўраўнілаўкі».

У Лагойску Шульговіч (заможнік) прапанаваў «самаабкладаньне налажыць на душах» (у яго мала сям'і).

У в. Ляды хацелі правесьці з двесяціны, а калі гэта не прайшло, пачуліся выгукі:

— Гультаі п'юць і прапіваюць, а нам за іх плаціць трэба.

У в. Торапава заможнік на сходзе кажа:

— Добрая рэч. Заплаціў падатку 120 р., а цяпер яшчэ абкладаньне, згарыць яно.

З усяго відаць, што кулакі і заможнікі прымаюць усе крокі, каб праваліць кампанію, карыстаючыся дзеля гэтага рознымі мэтадамі: «ўраўнілаўка» з сыстэмай: падворна, падвесяніцна, падушна; а мясцамі проста выступаюць і кажуць:

— Нас, сялян, забылі: ні лесу, ні зямлі не даюць, а ўсё абкладваюць ды абкладваюць (Юркаўскі с.-с.). У некаторых мясцох схіляюць на свой бок і бедняка. Я. К.

Лагойскі р., Меншчына.

Кулацкія „агітпропы“.

Самаабкладаньне па раёну падыходзе к канцу. Сходы праведзены амаль што ва ўсіх сельсаветах. У 76 вёсак налічана самаабкладваньня звыш 10 тысяч руб., налічвалася ў сярэднім па 25 проц. ад сельска-гаспадарчага падатку. Бедната і серадняцтва, наогул, ахвотна прымала закон аб самаабкладваньні, але заможная частка ўвесь час пярэчыла правядзеньню яго.

Асабліва выразна гэта выявілася ў вёсцы **Кісьцені**, дзе крыкуны заможнікі сарвалі сход.

Неабходна было зрабіць насып каля вёскі, бо рэчка ў часе разьліву можа зьнесьці 10 хат. На матар'ял патрабавалася 200 руб. і працоўная сіла, а кулакі на сходзе заявілі:

— Хай топяцца, а мы ім не паможам.

Актыў камсамолу пасьля вёў сябе ня вельмі актыўна: некаторыя вусім не пайшлі на сход, а бацькі іх галасавалі супроць жа свайго дабрабыту.

Кулацкаму **„агітпропу“** дапамагаў яшчэ мясцовы фэльчар, які галасаваў за 5 проц. самаабкладаньня.

У другой вёсцы—Вішчыне ўсе сяляне разумеюць, што неабходна арганізаваць пажарную дружыну, але калі на сходзе ўзьнялі пытаньне правесьці самаабкладаньне на пажарны інтвэнтар, то большасьць адмовілася.

Сходы у гэтых вёсках адкладзены. Трэба спадзявацца, што бедната асазнае свае памылкі і зробіць усё належнае, каб правесьці самаабкладаньне.

в. В-Крушынаўка, Бабруйшчына. Рагачэўскага р.

Я.

Падрыхтоўка да „Дню Друку“.

9-га красавіка пры Аддзеле Друку ЦК КП(б)Б адбылася нарада, прысьвечаная падрыхтоўцы да „Дню Друку“.

Нарада вынесла пастанову аб неабходнасьці правядзеньня газэтамі да «Дню Друку» кампаніі па падняцьці свайго тыражу.

5-га мая газэты павінны правесьці канфэрэнцыі сваіх чытачоў на больш буйных прадпрыёмствах і ў райёнах.

У гарадох павінны быць праведзены агульныя сходы працаўнікоў друку разам з рабкорамі і сьценкорамі. Да гэтых сходаў павінны быць прыстасаваны выстаўкі насьценных газэт і кніг. У райёнах такоама павінны быць праведзены сходы селькораў і чытачоў газэт з наладжаньнем выставак. Апрача гэтага, нарада прапануе ўсім выдавецтвам і бібліятэкам арганізаваць выстаўкі кніг.

Да „Дню Друку“ выдавецтвамі будзе прыстасоваи месячнік продажу кніг па зьніжанай цане. У Менску ды іншых буйных гарадох маюць быць арганізаваны кніжныя базары, лётарэі і г. д.

У райёнах маецца на ўвазе арганізаваць выстаўкі кніг у хатах-чытальнях, каапэрацыі, на рынках і ў кіосках, прычым кнігі будуць прадавацца па зьніжанай цане.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР.

Пятага красавіка г.г. пад старшынствам тав. **А. Чарвякова** адбылося пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК. Разгледжан шэраг пытаньняў.

Аб перадачы дзяржаўнай зямельнай маемасьці ў працоўнае карыстаньне.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад Наркамзему і садаклад НКРСІ аб выніках перадачы дзяржаўнай зямельнай маемасьці ў працоўнае карыстаньне ў БССР.

Усяго зямлі ў БССР 12.555.842 гкт. З гэтай плошчы ва ўласнасьці сялянства да 1917 г. знаходзілася толькі 54,3 проц., астатняя зямля знаходзілася галоўным чынам у руках абшарнікаў.

Калі прыняць пад увагу тое, што ў групу «сялянства» ўваходзіла і кулацкая вярхушка вёскі, дык процант землякарыстаньня бядняцка-серадняцкай часткі яшчэ больш панізіцца.

Кастрычнікавая рэвалюцыя праз нацыяналізацыю зямель рашуча зьмяніла характар землякарыстаньня ў бок найбольшага спрыяньня бяднейшаму сялянству. Па маючыхся ў Наркамземе зьвестках агульная плошча зямель на 1-X—27 г. па асобных карыстаньнях разьмяркоўваецца так:

1. У працоўным сталым сялянскім карыстаньні 63,8 проц.
2. З запаснага фонду яшчэ не разьмяркованага ў парадку земляўпарадкаваньня знаходзіцца ў фактычным карыстаньні сялянства 1,3 проц.
3. У лясох мясцовага значэньня 4,1 проц.
4. У запасным фондзе яшчэ не перададзеным сялянству 0,8 проц.
5. У дзяржаўным лясным фондзе 25,5 проц.
6. У дзяржаўнай зямельнай маемасьці 2,7 проц.
7. Зямель спэцыяльнага прызначэньня і гарадзкіх 1,8 проц.

Калі нават ня лічыць таго, што Савецкая Ўлада вядзе ў інтарэсах прамысловасьці і мясцовага насельніцтва лясную гаспадарку, сялянскае землякарыстаньне ўсё-ткі павялічылася на 14,9 проц., г. ё. сялянства атрымала ў сваё карыстаньне ў выніку Кастрычнікавай рэвалюцыі 1.869.315 гкт. зямельнай плошчы.

Склад дзяржаўнай зямельнай маемасьці некалькі разоў пераглядаўся, у мэтах перадачы яго бяднейшаму сялянству ў працоўнае карыстаньне; так, дзяржаўнай зямельнай маемасьці на 1-X—24 г. лічылася 511.183 гкт., на 1-X—27 г.—334.656 гкт. Большая частка неперададзенай яшчэ плошчы (194.491 гкт.) зьяўляецца няўжыткавай. Найбольш значную частку астатняй маемасьці (112.767 гкт.) складаюць савецкія гаспадаркі. Згодна пастановы ЦВК Саюзу ССР ад 1-X--27 г. і ЦВК БССР ад 11-X—27 году дзяржаўная зямельная маемасьць павінна быць уся перададзена ў працоўнае карыстаньне.

У складзе дзяржаўнай зямельнай маемасьці павінны застацца толькі: савецкія гаспадаркі, вучасткі рознага прызначэньня, тарпянікі і вадаёмы. Уся астатняя зямельная маёмасьць пяройдзе ў працоўнае карыстаньне сялянства, аб чым ужо Наркамземам, згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК, зроблена катэгарычная прапанова мясцовай уладзе. Згодна атрыманых з месц матар'ялаў, перадача гэтых зямель сялянству праводзіцца шпаркім тэмпам.

Тых зямельных фондаў, якімі заўладала сялянства ў першыя гады рэвалюцыі, не хапіла для надзяленьня зямлёй усіх безьзямельных і малазямельных гаспадарак.

У зьвязку з гэтым яшчэ да канца 1924 году Наркамземам, згодна пастановы IУ Сэсіі ЦВК УІ скліканьня, былі прыняты меры для стварэньня дадатковага зямельнага фонду і скарыстаньня яго для надзяленьня і данадзяленьня бяднейшых сялянскіх гаспадарак. Крыніцамі гэтага фонду зьявіліся: землі, якія аказаліся магчымымі перадаць з лясного фонду, з дзяржаўнай зямельнай маемасьці і ад абрэзкі буйных гаспадарак; кінутых і іншых зямель. Падлічваючы ўсю зробленую да 1-га кастрычніка 1927 году работу па арганізацыі фонду дзяржаўных зямельных маемасьцяй і перадачы ў працоўнае карыстаньне, можна прывесьці наступныя лічбы:

	Выключана да I/X-1927 г.	Разьмяркована да I/X-1927 г.	Засталося на I/X-1927 г.
З лясного фонду . . .	405.614	273.000	133.614 гкт.
З дзярж. зям. маемасьці . .	176.527	173.027	3.500 «
Ад абрэзак буйных гаспад. . .	204.478	86.146	118.332 «
Іншых зямель	54.979	48.295	6.684 «
Разам . . .	842.598	580.468	262.130 гкт.

Трэба яшчэ адзначыць, як адзін з галоўнейшых вынікаў аграрнай рэвалюцыі на Беларусі—надзяленьне зямлёю працоўнага яўрэйскага насельніцтва, якое пры царскай уладзе было прыгнечана і прымушана было жыць у мястэчках і займацца галоўным чынам саматужніцтвам і дробным гандлем. У выніку аграрнае рэвалюцыі яўрэйскае працоўнае насельніцтва атрымала да гэтага часу ў сваё карыстаньне 42.500 гкт.; да гэтай лічбы яшчэ трэба дадаць 11.500 гкт., якія да Кастрычн. рэвалюцыі знаходзіліся ў карыстаньні яўрэяў.

Задачай Наркамзему зьяўляецца далейшае разьмеркаваньне сярод бяднейшага сялянства астатку маючагася зямельнага фонду і вышуканьне новых дадатковых фондаў для тэй-жа мэты. Апроч дзяржаўных зямельных маемасьцяй засталося неразьмяркованым сярод прац. сялянства 33.000 гкт. б. падлесных плошчаў і 118.000 гкт. ад абрэзак.

Далейшая праца па выяўленьні новых зямельных фондаў будзе ісьці па лініі далейшых абрэзак лішкаў у шматзямельных гаспадарак, перадачы лясных зямель малапрыгодных для вядзеньня лясное гаспадаркі і галоўным чынам па лініі вышуканьня асушэньня балотных масываў, якіх у Беларусі налічваецца каля 2.000.000 гкт.

Навокал дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. У спрэчках выказаліся т.т.: Прафэрансаў, Чарвякоў, Бэйлін, Хацкевіч.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў для распрацоўкі праэкту пастановы па дакладу выдзеліць камісію ў складзе т. т. **Хацкевіча, Прышчэпава і Гэльтмана.**

Пастанова па дакладу аб перасяленьні.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў пастанову па дакладу (які быў зроблены на папярэднім пасяджэньні) аб перасяленцкай справе ў БССР.

Прэзыдыум ЦВК прызнаў працу Наркамзему ў галіне перасяленьня здавальняючай і адзначыў, што перасяленьне і расьсяленьне ў умовах БССР, пры існуючай аграрнай перанасяленасьці мае вялікае як эканамічнае, гэтак і палітычнае значэньне. Маючы на ўвазе, што галоўнымі мерамі аслабленьня аграрнай перанасяленасьці павінны быць у бліжэйшы час разьвіцьцё прамысловасьці, інтэнсіфікацыя с. г. і арганізацыя рэспубліканскіх фондаў на абжыткоўных і малаабжыткоўных забалочаных землях. Прэзыдыум ЦВК адзначыў, аднак, што і перанасельнасьць у бліжэйшыя гады павінна займаць значнае месца ў працы НКЗ і яго мясцовых органаў, у зьвязку з чым трэба зьвярнуць належную ўвагу савецкім і грамадзкім органам на перасяленцкую справу.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў зьвярнуцца да ўраду СССР аб павялічэньні перасяленцкага фонду для БССР і аб лепшым абслугоўваньні перасяленцаў з Беларусі (беларусаў, яўрэяў і іншых) у райёнах вадварэньня як па лініі гаспадарчай, так і па мэдыцынска-санітарнай і нацыянальна-культурнай.

Белсельбанку даручана пасьпяшыць з арганізацыяй з бягучага году выдачы банкаўскіх ссуд бядняцкаму насельніцтву на набыцьцё ліквідуемай перасяленцкай маемасьці і на аплату арэндных сум за зямлю, здаваемую ў арэнду перасяленцамі.

У мэтах узмацненьня сродкаў для перасяленьня і пабудовы на новых мясцох, прэзыдыум ЦВК пастанавіў прадаставіць права перасяленцам, як правіла, здаваць зямлю ў арэнду на 3 гады з моманту перасяленьня.

Пры распрацоўцы праэкту закону аб ільготах па сельска-гаспадарчаму падатку павінны быць прыняты пад увагу такія ільготы для беднаты, якія б сьцімуліравалі арэнду перасяленцкай зямлі, пераважна беднатой.

Для паслабленьня аграрнай перанасяленасьці Наркамзеляробства даручана праз спэцыяльныя экспэдыцыі выявіць усю колькасьць няўжыткоўных і малаўжыткоўных зямель з мэтай шырокай арганізацыі на іх унутрырэспубліканскіх калёнізацыйных фондаў на расьсяленьне і перасяленьня.

АБ СКЛАДЗЕ СЕЛЬСКІХ І МЕСТАЧК. САВЕТАЎ ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУГІ.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў да чарговых выбараў саветаў устанавіць склад сельскіх і местачковых саветаў Гомельскай акругі ў ліку 21 члена і 7 кандыдатаў, даўшы пры гэтым права Гомельскаму АВК зьмяншаць паказаны лік членаў да 10 чал.

Гомельскаму АВК дадзена права правесьці часьцінныя давыбары тых сельскіх і местачковых саветаў, якія пасьля райёнаваньня маюць лік членаў меншы, чым гэта вызначана пастановай Прэзыдыуму ЦВК.

НАЗНАЧЭНЬНІ.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў назначыць тав. **Буніна** Льва Майрымавіча Нам. Народнага Камісара Фінансаў БССР.

АБ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ВЫХАВАНЬНІ АСЬВЕТНІКАЎ *).

Ш. Палітасьветная праца.

У горадзе асьветнік у сваёй масе ае больш-менш свайго жыцьця на палітычную адукацыю, што датычыцца вяовага асьветніка, то тут справа значгорш: вясковы асьветнік па аб'ектўных умовах свайго жыцьця ня мае гчымасьці паднімаць свой палітузвень так, як гэта можа асьветнік раду. Мы на вёсцы яшчэ назіраем кія, праўда паасобныя, выпадкі: наўніца аднае вясковае школы ў ень 10-хгодзьдзя Кастрычнікавай рэвюцыі вывесіла ў школе наступны зунг: **„Няхай жыве міжнародная цыял-дэмакратыя“**. Зацікавіўшыся ым пытаньнем, мы пераканаліся, о гэты лёзунг быў вывешаны дзяючы элемэнтарнай палітычнай нясьменнасьці гэтае настаўніцы. Другі падак: у клясу ўвайшоў інспэктар, стаўніца загадвае вучням устаць і ьпяваць **„Адвеку мы спалі і с разбудзілі...“**. Аб чым гэта сьведць? Сьведчыць гэта, па-першае, аб кім палітычным узроўні гэтае наўніцы, па-другое — перанясеньні рых звычаяў у нашу савецкую олу і трэцяе—баязьнь „начальства“, о мае пад сабою падставу, бо мы чэ назіраем у некаторых мясцох гэтгі здарэньні, калі на сходзе асьветніў старшыня РВК, выступаючы па таньню аб грамадзкай працы, гаворць: **„Вы, настаўнікі, глядзеце е, а не то...!** гэтае «а не то» выціла 12 настаўнікаў пераехаць у угія райёны «по собственному жеанию». Магчыма было-б яшчэ прысьці шмат падобных выпадкаў, але нават гэтыя два гаворяць аб тым, што пытаньне падняцьця палітычнага ўзроўню асьветнікаў, асабліва вясковага, вымагае ад прафарганізацыі значна большае рухавасьці ў гэтай справе, чымся было да гэтага часу, а таксама вымагае ад кожнага асьветніка асабістае ініцыятывы ў справе палітычнай адукацыі, каб не адставаць, а быць вышэй у гэтым напрамку ад акаляючага насельніцтва.

Што нам трэба зрабіць па гэтай галіне:

1. Наладзіць больш сыстэматычна справу палітадукацыі. Выжыць маючуюся ў некаторых праформах вядбайнасьць і безадказнасьць у гэтай справе.
2. Аказваць большую дапамогу асьветніку як матар'яльна, так і парадамі.
3. Дыфэрэнцыраваць праграмы палітадукацыі, прыстасоўваючы іх да ўзроўню і запатрабаваньняў розных груп.
4. Папоўніць райённыя бібліятэкі палітычнаю літаратураю.
5. Пленум даў дырэктыву абмеркаваць пытаньне аб мэтазгоднасьці арганізацыі нармальных палітшкол для гарадзкіх асьветнікаў.
6. Увязаць працу з бягучымі практычнымі пытаньнямі агульна-палітычнага жыцьця і канкрэтнымі матар'ялямі з працы мясцовых савецкіх, гаспадарчых і іншых арганізацый (хлебазагатоўкі, сялянская пазыка, рацыяналізацыя апарату, барацьба з бюракратызмам і інш).
7. Паляпшэньне мэтадычнага боку палітасьветпрацы.

Формы і бліжэйшыя мерапрыёмствы ў палітасьветнай працы:

1. Прасоўваньне пэрыядычнае і непэрыядычнае літаратуры ў асьветніцкую масу. Увесьці ў сыстэму культпрацы сыстэматычную чытку газэт, асабліва кіруючае палітычным і асьветніцкім жыцьцём.
2. Арганізацыя і дапамога ў самаадукацыйнай вытворчай працы, падняцьце кваліфікацыі і перакваліфікацыі.
3. Уцягваньне асьветнікаў у гурткі партыйнае і камсамольскае асьветы.
4. Пастаноўка пры Домах Асьветы і чырвоных кутках кансультацый па актуальных пытаньнях грамадзка-палітычнага жыцьця.
5. Увесьці ў сыстэму сталую прапрацоўку рашэньняў партыйных, савецкіх, прафсаюзных зьездаў і сусьветных кангрэсаў.
6. Наведваньне адчыненых сходаў партыйных і камсамольскіх ячэек.

Вось галоўныя формы і зьмест палітасьветнае працы.

Вялізарную ролю ў падняцьці палітузроўню і палітычнае сьвядомасьці адыгрываюць розныя палітычныя кампаніі і дэманстрацыі, як адна з форм масавае работы.

Трэба дабіцца, каб кожная палітычная кампанія, якая павінна згуртоўваць працоўныя масы навокал злабаднеўных пытаньняў, не праходзіла па шаблёну, каб увязвалася з практычнымі задачамі сучаснага дню, каб належна падрыхтоўвалася з тэхнічнага боку.

Няўважлівая падрыхтоўка кампаніі ці дэманстрацыі, павярхоўны даклад, шаблёнізацыя кампаній адштурхвае масы ад наведаньня масавых сходаў і дэманстрацый.

IV. Рэлігійнае пытаньне.

На адным з агульных сходаў асьветнікаў гор. Менску рабіў даклад аб праблеме культурнае рэвалюцыі т. Кнорын. У сваім дакладзе тав. Кнорын закрануў пытаньне рэлігійных забабонаў. Некаторыя ўдзельнікі сходу пыталіся: няўжо-ж трэба аб гэтым гаварыць асьветнікам і агітаваць іх за зьнішчэньне рэлігійных забабонаў?

Памойму трэба і вельмі трэба, бо мы нажаль яшчэ маем, праўда паасобныя выпадкі, калі клерыкалізм узмацненне свой уплыў нават на паасобных асьветнікаў. Мы маем, напрыклад, пару такіх выпадкаў: 1) адна настаўніца ня хрысьціла свайго дзіцяці да 5 года, на 5 годзе ахрысьціла, 2) другая настаўніца, нават у Менску, хавала сваю памёршую сястру з ксяндзом, прычым шмат вучняў тае школы, дзе працуе гэтая настаўніца, таксама былі ўцягнуты ў гэтую рэлігійную дэманстрацыю (іначай назваць гэта нельга). Можна было-б яшчэ назваць некалькі падобных выпадкаў, але і з гэтых двух выплывае вострая неабходнасьць барацьбы з клерыкальным уплывам. Асабліва рашуча трэба паставіць пытаньне барацьбы з нэйтралітэтам асьветнікаў па пытаньню рэлігіі, аб гэтым нейтралітэце шмат гаварылі настаўнікі на Менскай гарадзкой канфэрэнцыі. Савецкая асьвета грунтуецца, на прынцыпах рэвалюцыйнага марксызму, марксызм зьяўляецца ярым антыпадам рэлігіі,—таму той, хто выкладае

Плявок беларускай мове і школе малапісьменных.

Таварышы, сьпявайце гімны! Мацней, яшчэ мацней крычыце ура!.. Галоўпалітасьветы—вялікі пераможца...

Фэльетаністы, ша! Адной тэмай у вас менш, але ня сумуйце, бо перамога каштуе сотняў фэльетонаў...

— У-у-р-р-р-а-а! Канчаткова зьлікідавана няпісьменнасьць, і... Галоўпалітасьветы, хутка перабудаваўшы свае шэрагі, павёў барацьбу па ліквідацыі... пісьменнасьці...

!!!???

Бо, відаць, перамога датэрміновая...

* * *

Перада мною—дапаможнік для школ малапісьменных, вокладку якога ў «называнне потомству» прыводзім літаральна:

УСЕ НА БАРАЦЬБУ З НЯГРАМАТНАСЬЦЮ!
СУПРОЦЬ КАПІТАЛІСТЫХ І ПАМЕШЧЫКАЎ.

Склалі:
П. КАПАЕВІЧ, ПАНАМАРЭНКА, СЕЎРУК І С. ШМУЛЕВІЧ.

Дапушчана Навукова-Мэтадалёгічным Камітэтам Наркамасьветы БССР у якасьці дапаможніка для школ малапісьменных.

Выданьне
ЦЭНТРАЛЬН. САВЕТУ Т-ВА «ПРЭЧ НЯГРАМАТНАСЬЦЬ».
МЕНСК—1928 Г.

„Мэта 6-кі «За грамату» і ў прыватнасьці гэтае кніжкі, пішуць яе ўкладчыкі,—«даць лёгка напісаную, цікавую і даступную кніжку для дарослага малапісьменнага рабочага і селяніна».

Наколькі яна «лёгка» пісалася, відаць ужо з вокладкі дапаможніка. Справа, прыкладна, была гэтак.

Капаевіч (да іншых укладчыкаў): А што, хлопцы, ці не напісаць нам дапаможнік для школ малапісьменных?

Усе раазам: Абы грошы, а кніжку скласьці гэта нам раз плюнуць...

Плюнулі раз, плюнулі два—і кніжка гатова...

Першы плявок атрымалі беларуская мова і яе правапіс, а другі... другі ўжо школа, куды накіравана 1500 экземпляраў гэтай бязглузьдзіцы.

Укладчыкі на асобнай старонцы далі лёзунг Леніна. Падаем яго таксама літаральна:

«Бязграматны чалавек стаіць па-за палітыкай, яго спачатку трэба навучыць азбуцы. Без гэтага ня можа быць палітыкі, без гэтага ЕСЬЦЬ толькі чуткі, ПІЕТКІ байкі, забабоны, але не палітыка».

Праглядаю аркуш за аркушам, спрабую падкрэсьліць памылкі, але жах бярэ, бо з дзяцінства ўжо прывычка даваць веру друкаванаму слову.

Дзякуй вучню-першагодніку, дальбог сьмеласьці паддаў!

— Бачыце, бачыце колькі памылак? Гэта вось расейскія словы, а гэта ня тое і ня сёе,—паказвае мне хлапчук.

Памылкі пачынаюцца з першай старонкі і г. д. аж да канца.

Падаём для прыкладу некалькі сказаў з захаваньнем правапісу нашых укладчыкаў.

„СЬВІСНУЎ бізун... Не пасьпела пані СПЫТАЙЦЦ, чаго яна плача, як прыводзіць ГАРОДНАК... Колькі яе НЯ пыталі.. Чуе Рыгор—у лесе сучкі САТРАШЧАЛІ... Стары войт Рымарчук зраньня быў ня ў РУМАРЫ І ДУМКАХ пасылаў да ўсіх чартоў здохлую заморскую сучку... За яе, праклятую, то і дзіві, і сам СТРАЦІЦЬ панскую ласку... На яго валіць усе ТРУДНЕЙШЫЯ і нярпрыемныя даручэньні. Загінаў ПАЛЬЦІ. Толькі ўсе надта далёкія, вёрст за ДВАДЦАЦЬ, ТРЫДЦАЦЬ і далей. Ён, НАРЭШТЭ... Так і яму ПРЫКАЖЭЦЕ (у аўтара перакажыце)... Бязьлюднае сьнегавое поле ІЗНОЎ супакойвала... Яшчэ трое ША ІЛІСЬ І БАРАХТАЛІСЬ. Ну, ЧТО-Ж баба? Селядцы выбіраць, як НАЙСАЛЬНЕЙ. З ГЎБ яго йшла... Хворы хацеў разамкнуць зубы, але ня МАГ... Я кінуўся ўверх па ЛЕСЬНІЦЫ... (і тут жа праз некалькі радкоў)—пагромшчыкі беглі ўніз па сходах. У ночы, У ГЛУХІМ МЕС, ЦЫЗА рочкай зноў сабраліся нашы хлопцы"...

Досыць, хопіць і гэтага... Сапраўды, далі лёгка напісаную, цікавую і даступную кніжку.

* * *

Дык як-жа-таварышы „Укладчыкі" і паважаны Мэтадком?

«Дапаможнік» атрымаўся проста на «ять»...

А можа мы мыляемся, можа гэта новы, ваш уласны правапіс?

Кажаце надрукавалі 3000 экз. і добрую палову ўжо на месцы накіравалі?...

А чаму Навукова-Мэтадалёгічны камітэт да гэтай кнігі мэтадычнага ліста не апрацаваў?

Нядобры народ у Мэтадкоме: ведаюць, што настаўніку будзе цяжка разабрацца ў іх правапісе, і хоць бы пару мэтадычных заўваг!

* * *

Кажуць, што на першым жа пасяджэньні Мэтадкому старшыня апошняга зьбіраецца ставіць пытаньне аб канфіскацыі дапаможніка.

Правільна, бо інакш настаўнікі закідаюць вас імі.

Урэшце-ж, вясёлы народ сядзіць у Мэтадкоме.

Ухвалілі друкаваць лекцыі аднаго шаноўнага дацэнта, а пасьля сваю візу зьнялі: «Мы, кажуць, ня мы, і коні ня нашы».

Ухвалілі да друку дапаможнік, надрукавалі, нават па школах разаслалі, а зараз... канфіскаваць...

Дальбог вясёлы народ! А вы кажаце, што ў нас працаваць ня ўмеюць: любата, а ня праца.

Усё-ж, шаноўныя таварышы, дазвольце паставіць вам пару пытаньняў:

— Якім чынам выпушчана з друку і накіравана ў школы гэткая бязглузьдзіца?

— Ці ня лічыце вы гэты выпадак зьдзекам над беларускай мовай і нашай школай?

— Колькі грамадзкіх тысяч рублёў выкінута таварыствам «Прэч Няпісьменнасьць» на вецер?

— Ці „ізнов" вы думаеце гэтак „шаліцца" пры выпуску беларускіх кніжак?

В. Зайцаў.

Вынікі калдагаворнай кампаніі.

(З пленуму ЦСПСБ).

9-га красавіка ў клюбе імя Карла Маркса адчыніўся чарговы пленум ЦСПСБ.

Першым пытаньнем быў заслухан даклад аб выніках калдагаворнай кампаніі. Гэтаму пытаньню пленум аддаў шмат увагі. У спрэчках па гэтым пытаньні выступілі 23 дэлегаты.

У сваёй пастанове пленум перш за ўсё адзначыў, што прэзыдыумам ЦСПСБ і большасьцю саюзных арганізацый была праведзена здавольняючая падрыхтоўка да перазаключэньня калдагавораў; узрасла актыўнасьць рабочых пры абгаварэньні гэтых дагавораў; павялічылася зарплата рабочым і інш.

Побач з гэтым пленум адзначыў наступныя недахопы ў ходзе калдагаворнай кампаніі:

Абгаварэньне калдагавораў па некаторых саюзах праводзілася без належнай увагі, што адбілася на актыўнасьці рабочых і выклікала з боку іх нараканьні.

Да недахопаў трэба аднесьці і некаторую зацяжку перагавораў з гаспадарчымі органамі, недастатковую падрыхтоўчую працу з боку некаторых саюзаў, пасыўныя адносіны гаспадарчаў да абгаварэньня калдагавораў, невыстарчальны ахоп калдагаворамі працаўнікоў бюджэтных устаноў, выпадкі адмаўленьня з боку некаторых органаў падпісаць дагаворы (Н.К. Асьветы, ЦСУ, НКЗ) і іншыя недахопы.

Для зьнішчэньня ўсіх выяўленых недахопаў у калдагаворнай кампаніі пленум запрапанаваў усім саюзным арганізацыям прыступіць да вывучэньня вынікаў кампаніі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на тарыфікацыю ставак, праводзячы сыстэматычную праверку выканаьня дагавораў і не дапускаць іх парушэньня.

З.

ХРОНІКА.

СУПРОЦЬ СУДУ НАД ГРАМАДОЙ.

У ЦК Мопр'у БССР штодня паступае з розных куткоў Беларусі шмат рэзалюцый-пратэсту супроць суду над Беларускай Грамадой. «Панам ня ўдасца задавіць рэвалюцыйны рух рабочых і сялян Заходняй Беларусі і Польшчы»—заяўляюць у сваім пратэсьце сяляне вёскі Чырвоныя Горкі, Койданаўскага райёну.

«Вітаем барацьбітоў польскай рэвалюцыі! Вышэй чырвоны сьцяг»,—заяўляюць студэнты і навуковыя працаўнікі Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі.

Аналёгічныя рэзалюцыі паступілі ад сялян пасёлку «Чырвоны Маяк», Багушэвіцкага райёну, ад рабочых лесазаводу ў Гомелі, ад сялян вёскі Калантаева і шмат іншых.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА УСЕАГУЛЬНЫМ НАВУЧАНЬНІ.

Наркамасьветы пастанавіў склікаць на 3 мая г. г. усебеларускую нараду па ўсеагульным навучаньні. На гэтай нарадзе будуць заслуханы інфармацыйныя даклады з месц аб выніках працы за бягучы навучальны год і вопыце ўвядзеньня абавязковага навучаньня ў Менскай акрузе. Апроч таго, будзе заслухан даклад аб становішчы школьнага будаўніцтва і мерапрыёмствах да яго палепшаньня. Нарада працягнецца 3 дні.

ВЯСЕНЬНІ ПЕРАПЫНАК У ШКОЛАХ.

Нар. Кам. Асьветы ўстанавіў вясеньні перапынак на агульна-адукацыйных курсах, у школах 2-й ступені, сямігодках і чатырохгодках (гарадзкіх і мястачковых), у прафтэхнічных і сельска-гаспадарчых школах, у вячэрніх школах павышанага тыпу і ў школах рабочай моладзі з 29-га красавіка да 6 мая ўключна. У школах сялянскай моладзі вясеньні перапынак устаноўлен з 20-га красавіка да 5-га мая.

КАЛІ АДБУДУЦЦА ВЫПУСКІ НА ЛІКПУНКТАХ.

Выпускі на лікпунктах сёлета адбудуцца з 25-га красавіка да 1-га мая.

У часе выпускаў адбудуцца ўрачыстыя сходы і вечары, на якіх будуць выдавацца падарункі скончыўшым лікпункты.

ПАДРЫХТОЎКА ПРАПАГАНДЫСТАЎ ДЛЯ ВЁСКІ.

На ўсесаюзныя курсы па перападрыхтоўцы вясковых прапагандыстых для нацменшасьцяў ад БССР камандыруецца 11 чал., з якіх 5 палякаў, 4 яўрэі і 2 латышы.

Курсы арганізаваны АПО ЦК УсеКП(б) і разьлічаны на двухмесячны тэрмін навучаньня. Заняткі на курсах пачнуцца з 1-га чэрвеня.

«ЗМАГАЙЦЕСЯ З ЦЕМРАЙ»

У сувязі са сьвятам „вялікадня" у рабочых клюбах г. Менску адбываюцца антырэлігійныя вечары. У якасьці дакладчыкаў на гэтых вечарох выступаюць навуковыя працаўнікі БДУ. Цэнтральны Савет т-ва «Прэч Няпісьменнасьць» выпусьціў газэту „Змагайцеся з цемрай", у якой высьветлена сутнасьць рэлігійных сьвят. У газэце зьмешчаны артыкулы—сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Кнорына, загадчыка АПО ЦК КП(б)Б тав. Абрамчука, пісьменьніка Крапівы, тав. Шукевіча-Трацьцякова і інш.

ПРАМТАВАРЫ ДЛЯ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ.

У сакавіку Белкаапсаюз завёз розных прамтавараў для забесьпячэньня спажывецкай каапэрацыі БССР на суму ў 3.112.000 руб. У красавіку мяркуецца завезьці прамтавараў на 2.475.000 р.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СПЛАЎНАЙ КАМПАНІІ.

ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых разгарнуў вялікую падрыхтоўчую працу да сплаўнай кампаніі. На мясцох ужо заканчываецца заключэньне дагавораў па сплаву. Закончаны таксама перагаворы з акруговымі аддзеламі аховы здароўя адносна абслугоўваньня мэдычнай дапамогай сплаўшчыкаў. Прымаюцца меры да культурнага абслугоўваньня рабочых-сплаўшчыкаў.

ДОМ АДПАЧЫНКУ ДЛЯ С.-Г. РАБОЧЫХ.

У хуткім часе ў Воўчкавічах (недалёка ад Менску) для сяброў саюзу с.-г. і лясных рабочых адчыняецца дом адпачынку. Усяго за летні сэзон мяркуецца прапусьціць праз гэты дом каля 200 чалавек. На ўтрыманьне дому адпушчана 3000 руб. Для батракоў, лясьнікоў, пастухоў і рабочых савецкіх гаспадарак будуць прадстаўлены бясплатныя месцы. Пасылка ў дом адпачынку пачнецца з 15 мая.

СУД.

Барысаўскія „каапэратары".

Апошнія два гады буйныя барысаўскія гандляры—Файнбэрг, Іоффэ, Пеклер і Давідсон, а таксама і менш значныя гандляры Барысаўскага райёну жылі надта добра. У іх заўсёды былі ў дастатку дэфіцытныя тавары нават тады, калі найшчык ніяк ня мог знайсьці іх у каапэрацыі. Ды чаму прыватнікам было і ня мець гэтых тавараў, калі тут, у Барысаве, пад самым бокам багатыя базы прыгароднага спажывецкага таварыства і Барысаўскі ЦРК, «найшчыкамі» якіх прыватнікі лічыліся праз «чорны ход».

У 1926 годзе, калі спажывецкая таварыства і ЦРК разгарнулі гандаль, калі насельніцтва гужам паваліла за таварам у каапэрацыю, прыватны гандаль, здавалася, дажываў апошнія хвіліны. Часам прыватнікі барысаўскага «сьвету» з удзелам дэлегатаў ад райённых гандляроў зьбіраліся на нарады—распрацоўвалі плян, як выйсьці з пяжкага становішча. Адны казалі, што трэба ехаць на тавар у Маскву і на Украіну, а другія не згаджаліся і даказвалі, што паездка і дастаўка тавараў з Масквы і Украіны будзе вельмі дорага каштаваць. Урэшце, прыватнікі рашылі «наладзіць сувязь» з служачымі мясцовай спажывецкай каапэрацыі і ЦРК Доўга прыватнікі хадзілі, нюхалі, абівалі парогі каапэрацыі і, урэшце, зьнюхаліся: старшыня спажывецкага таварыства Шышла, загадчыкі крам: Грыбоўскі, Бурка, Аўрупін і прыказчык Лібэрман першыя адгукнуліся на нядолю прыватнікаў. З вясны па сьнежань 27 году па 5—6 разоў ў месяц гэтыя «каапэратары» акуратна дастаўлялі прыватнікам ходкую мануфактуру на 800 мэтраў зараз. Сьляды злачынства «каапэратары» захоўвалі, выпісваючы дробныя чэкі. У хуткім часе прыватнікі „пасябравалі" з загадчыкамі крам ЦРК—Лянцдрасам, Гінзбургам, Пагаржэльскім і Гугарымам, ад якіх пачалі атрымліваць буйныя партыі пшанічнай мукі, крупы, селядцоў ды іншых харчавых тавараў. Па вечарох і ў выхадны дзень каля крам спажывецкай і рабочай каапэрацыі прыватнікі працавалі, як мурашкі, дэфіцытныя тавары вазамі плылі ў іх крамы, а прылаўкі каапэрацыі паставалі. Калі прыходзілі купіць сёе-тое найшчыкі, то заўсёды чулі адзін адказ: «Пачакайце з тыдзень, тавар будзе». Сумленныя працаўнікі каапэрацыі не маглі бачыць такога зьявішча, і хутка пасыпаліся скаргі.

Да судовай адказнасьці прыцягнута 11 адказных служачых каапэрацыі і 6 прыватных гандляроў Справа будзе разглядацца ў канцы красавіка г. г. у выязной сэсіі Менскага акруговага суду ў гор. Барысаве з удзелам пракурора і абароны пад старшынствам тав. Жылінскага.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Лістаносец-растратчык.

Іван Шэмпель, будучы лістаносцам Смаляніцкай пошты, грошай па пераводах не здаваў па належнасьці, а забіраў сабе, пры чым падрабляў подпісы прасталаў. Гэткім чынам Шэмпель прысвоіў 115 р. 44 кап. Суд прыгаварыў Івана Шэмпеля на год зьняволеньня, але на аснове амністыі ад трыманьня пад вартай вызваліў Іск паштовай канторы ў суме 115 руб. 44 кап. здаволен.

Парадак прыёму ў рабочых амбуляторыях.

З 6 красавіка хатняя і амбуляторная мэддапамога дэцэнтралізавана па амбуляторыях: 2-й (Нова-Маскоўская 24, тэл. 825); Камароўскай амб. (Красная 22, тэл. 922), Пярэсьпянскай амб., (Крапоткіна 33, тэл. 456) і Лихаўскай амбуляторыя (вул. Лекерта, тэл. 1157).

У ЦР Амбуляторыі прымаецца запіс на дом і прыём хворых тых, якія жывуць у цэнтральным райёне, згодна сьпіскаў. Для выкліку доктара на дом неабходна зьвяртацца ў райённыя амбуляторыі; там-жа выдаюцца даведкі аб дапамозе і вырашаюцца пытаньні аб водпусках. Кансультантам па ўсіх спэцыяльнасьцях—у ЦР Амбуляторыі праз райённыя амбуляторыі.

Начное дзяжурства толькі ў Цэнтральн. Амбуляторы з 6 час. веч. да 6 раніцы.

Па нядзелях і рэвалюцыйных сьвятах дактары выклікаюцца з ЦРА (райённая дапамога) ў выключных выпадках.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

Курсы арганізатараў масавых гульняў.

Надыходзячы летні перыяд мае быць вельмі шырока выкарыстан у справе ўцягненьня самых шырокіх колаў насельніцтва Менску ў заняткі фізкультурай. У сувязі з гэтым МАСФК разам з акрэалітпрасьветай арганізуюць у бягучым месяцы курсы для падрыхтоўкі 80 ч. арганізатараў масавых гульняў і забаваў.

Агітацыйны прабег.

МАСФК арганізуе ў нядзелю, 22 красавіка, агітацыйны прабег па Менску мужчынскіх і жаночых гурткоў ФК. Фініш прабегу адбудзецца на Пляцу Волі.

Новы склад прэзыдыуму МАСФК.

Менскім Акр. Выканаўчым Камітэтам зацьверджан новы склад прэзыдыуму Менскага Акруговага Савету Фізкультуры ў гэткім складзе: П. Нісэнбаум (старшыня), Брадоцкі (нам. старшыні); сябры Гозьбрайх (ад ЦСПСБ), Лук'янчык (Дынамо), Анупін (Асавіяхім), Макараў (вайск), Юшкевіч (Акрана), Пятровіч (актывіст ф-к), Гурэвіч (доктар), Зэлікман (сэкратар) і Каркоцкі (тэхком).

25 арганізатараў фізкультуры.

Ляхаўскія курсы вайскова-камсамольскіх працаўнікоў выпусьцілі 25 чалавек фізкультарганізатараў для камсамольскай ячэйкі.

Дасягненьні ў працы Менскай страхкасы.

За 1926-27 год Менская акруговая страхкаса мае значныя дасягненьні: узрасла колькасьць застрахаваных на 8031 чал., ці на 25,2 проц., павялічылася дапамога беспрацоўным з 338430 руб. да 504585 р. (на 49,1 проц.). Апроч гэтага, Менская страхкаса выдала 45000 руб. на арганізацыю працкалектываў, 7000 руб. на грамадзкія работы і 5895 руб. на арганізацыю начлежнага дому і сталоўкі для беспрацоўных.

У зоолёгічным музэі ІБК.

Да гэтага часу зоолёгічны музэй Інбелкульту меў орнітолёгічны (аддзел птушак) і біалёгічны аддзел.

У хуткім часе адчыняецца аддзел зьвяроў, у якім будуць выстаўлены розныя віды зьвяроў, якія водзяцца ў беларускіх лясох (вубр, двікая каза, барсук, выдра, воўк і інш.).

Для папаўненьня калекцыі зоолёгічнага музэю ў Мазыршчыну выехаў супрацоўнік ІБК, як зьбірае там розныя жывёлы.

7 новых дзіцячых прытулкаў.

У хуткім часе ў Менску будзе адчынена 7 дзіцячых прытулкаў (ачагоў) на 400 дзяцей. Прытулкі маюць працаваць у працягу цэлага году.

КАМІСІЯ ДЛЯ АЦЭНКІ НАВУКОВАЙ І ПЭДАГАГІЧНАЙ ДЗЯЙНАСЬЦІ ДАЦЭНТА БДУ ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧА.

Для ацэнкі навуковай і пэдагагічнай дзейнасьці дацэнта Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту т. Воўк-Левановіча ў зьвязку з цэлым шэрагам артыкулаў у газэце „Савецкая Беларусь" і для разгляду канфлікту паміж Воўк-Левановічам і студэнтамі Лінгвістычнага Аддзяленьня Пэдфаку БДУ, Народны Камісарыят Асьветы ўтварыў камісію ў складзе старшыні—Інспэктара Вышэйшых Навучальных Устаноў НК Асьветы тав. С. Г. Лысова і членаў. старшыні Галоўнавукі НК Асьветы тав. С. М. Некрашэвіча, прафэсара мовазнаўства Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту тав. Бузука, Інспэктара Пэдагагічнай Асьветы НК Асьветы тав. Аніхоўскага і дацэнта беларускай мовы Беларускага Дзяржаўнай Акадэміі Сельскай і Ляской Гаспадаркі тав. М. Гарэцкага, прафэсара беларускай літаратуры Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту тав. Пістуховіча, старшыні Прафкому факу БДУ—студэнта тав. Ісаакава і намесьніка рэктара БДУ тав. Слоніма.

Культурныя навіны.

ПАБУДОВА УНІВЭРСЫТЭЦКАГА ГАРАДКА.

Хуткім тэмпам вядзецца падвоз цэглы, жалеза і інш. будаўнічых матар'ялаў для пабудовы Унівэрсытэцкага Гарадка. Канчаткова распрацаваны і зацьверджаны праэкты пабудовы 5-ці корпусаў.

Гатовы дваямі начлынаецца высяленьне кватарантаў з дамоў, якія будуць зносіцца. Для абслугоўваньня рабочых будуць пабудаваны баракі, сталоўка і інш.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ Ў БДУ.

25-га мая на мэдфаку БДУ распачынаюцца дзяржаўныя экзамены для студэнтаў, якія сёлета кончылі Унівэрсытэт.

Старшынёй экзаменацыйнай камісіі вызначан праф. Кроль.

ВЫДАНЬНЕ МАТАР'ЯЛАЎ АБ ПАЎСТАНЬНІ 863 г.

Гістарычная камісія польсэктару супольна з катэдрай гісторы Беларусі выдае цікавы матар'ял пад назвай—„Беларускі рэвалюцыйны і контр-рэвалюцыйны друк у часе паўстаньня 1863 г. на Беларусі". Гэтыя цікавыя дакументы да апошняга часу ня былі вядомы ў гістарычнай літаратуры. Ёсьць такія дакументы, як «гутарка двох суседзяў № 4» і інш.

Матар'ялы вельмі яскрава выяўляюць рэакцыйную дзейнасьць Мураўёва. Па рэвалюцыйнаму друку гэтых матар'ялаў можна прасачыць барацьбу чырвоных з белымі ў часе паўстаньня 1863 г.

ЭКАНАМІЧНАЕ І САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ 19-ГА СТАГОДЗЬДЗЯ.

У Публічнай Бібліятэцы ў Ленінгрэдзе знойдзены манускрыпты пратаколаў і загады стаўленікаў Наваязова, якія ў часе гаспадарыць на Беларусі пасьля заняцьця арміі Аляксандра 1-га. Дакумэнты высьвятляюць эканамічнае і сацыяльнае становішча Беларусі ў пачатку 19-га годзьдзя.

Гэтыя дакументы зараз вывучаюцца ІБК.

НАВУКОВАЯ ЭКСПЭДЫЦЫЯ Ў ДАНАВА.

Гістарычная камісія супольна з арэалёгічнай ладзіць сёлета навуковую экспедыцыю ў м. Койданава. Мэта экспедыцыі—вывучэньне зямку беларуска-літоўскага рыяду і шэрагу курганоў, якія знаходзяцца ў ваколіцах Койданава.

ЭКСКУРСІІ І ТУРЫЗМ.

Падаючы вялікае значэньне экскурсіям і турызму, ЦБ пратэстуе БССР за тое, што ён дазвала ўсім студэнцкім арганізацыям і гурткам падрыхтоўку да гэтай працы.

Пры ўсіх выкавбюро студэнцкіх гурткоў маюць быць арганізаваны экскурсійныя камісіі, якія будуць вясьці падрыхтоўчую і арганізацыйную працу па ладжаньня экскурсій. Правіцыяльным гурткам ЦБ прапануе працаваць у дзіць экскурсіі у Менск з тэм, каб пазнаёміцца з сталіцай БССР.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 11 красавіка—два кіно-сэансы—„Парижский сапожник". Пачатак у 7 з палов. гадзін вечара.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У чацьвер, 12 красавіка, а 7-й гадз. вечара асыстэнт БДУ САГАЛОВІЧ Г. Н. прачытае даклад на тэму: „Элементы варыяцыённай статыстыкі ў працы пэдагога". Прысутнасьць членаў фіз.-мат. гуртка абавязкова, прыродазнаўцаў—пажадана.

— У пятніцу, 13 красавіка, а 7-й гадз. вечара дац. БДУ ШАЛАУРАЎ прачытае даклад на тэму: «Абгляд вучэбна-мэтадычнай літаратуры па фізіцы». Пажадана прысутнасьць членаў фіз.-матэм. гуртка і выкладчыкаў г. Менску. Уваход вольны.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 11 КРАСАВІКА 1928 г.).

Абл. 1 дзяржаў. паз.—прад. 4—61, 4—59; абл. 2-й дзяржаў. паз.—прад. 4—[illegible] куп. 4—94,5; абл. 2-й сял. паз.—[illegible] абл. 3-й сял. паз.—прад. 5—92,5, 5—00,5; абл. 10 проц. паз. 27 г.—25—15, куп. 25—05; абл. дзяржаў. 26 г.—прад. 119—50, куп. 117—5[illegible] 12 проц. дзяржаў. паз.—прад. 104—3[illegible] 104—34; абл. 5 проц. паз. індустр. 24—35,5, куп. 24—23,5.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕ[illegible]

ТЭАТР-КІНО.

ЯЎРЭЙСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Чацьвер 12 красавіка „ОВЕЧИЙ ИСТОЧНИК" у 3-х актах.
Білеты ў касе тэатру.

Пятніца 13 і субота 14 красавіка „ГИРШ ЛЕКЕРТ"
Драматычная паэма ў 3-х акт., 10 карц.
Білеты на 13—у саюзе савгандльслуж., на 14 усе білеты прададзены.
Пачатак спэктакляў у 8 з пол. гадз. веч.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
З аўторка, 9-га красавіка, выдатны нямецкі артыст КОНРАД ВЭЙДТ у новай выключнай нямецкай пастаноўцы
„ЦІ СЬМЕЕМ МЫ МАЎЧАЦЬ".
Трагэдыя ў 7-х частках.
Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадз. веч. ТОЛЬКІ 3 СЭАНСЫ!

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ»
З карціны за адзін сэанс!
I. Савецкі бытавы фільм „ДОМ В СУГРОБАХ" у 6 частках.
II і III. Дзьве амэрыканскія трукавыя камэдыі:
„НАХОДЧИВЫЙ ПОКЛОННИК" у 2 частк.
і „ДЖЕК, СЛОН И К-о".
Пачатак сэансаў у 6 з пал. гадз. веч.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".
2 фільмы за адзін сэанс. 2
I. „ДОЧЬ ДЖУНГЛЕЙ" драма ў 6 частках.
II. „ПОБЕГ" драма ў 6 частках.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
ЯШЧЭ 6 ДЗЁН
грандыёзны гістарычна-рэвалюцыйны баявік
„КАСТРЫЧНІК".

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вуючтна-конская карт. Красоўскага Ц., выд. Чэрвенск. вайск. сталом у 1925 г. кв. 467.

— Вуючтна-конская карт. Пятровіча Ф., выд. Хутарскім ВВК у 1923 г. кв 418.

Конская кніжка Баратуха Ф. П., выд. б. Клінокским ВВК б. Чэрвенскага павету, кв. 476.

Супрацоўнікі хэмічнае лябараторыі Інбелкульту выказваюць глыбокае спачуваньне
Васілю Восіпавічу ВЯРШУКУ
з прычыны сьмерці адзінай дачкі ІРАЧКІ.

Кіраўніцтва Менскага Акруговага Аб'яднаньня Працкалектываў падае да ведама ўсіх спажыўцоў, што
З 1-ГА КРАСАВІКА Г. Г. ПАЧАЎ ФУНКЦЫЯНАВАЦЬ НАНОВА АРГАНІЗАВАНЫ
ПРАЦКАЛЕКТЫЎ ЗАВОД ПА ВЫРАБУ ЖОРНАЎ ДЛЯ МЛЫНУ, ТАЧЫЛЬНЫХ КАМЕНЬНЯЎ І МЯНТАШАК.
Завод адпускае для млыноў усе матар'ялы для наліўкі каменьняў.
Адрас: Менск, вул. Розы Люксэмбург, 26. За спраўкамі зьвяртацца ў Кіраўніцтва, Рэвалюцыйная, 8, тэл. № № 747, 677 і 1208.

СУДОВЫ ВЫКАНАЎЦА 10 ВУЧ. МЕНСКАЙ АКРУГІ ЯХНІЧ Н.

АБВЯШЧАЕ,

што 16 красавіка 1928 г. а 4 гадз. дня ў г. Барысаве па Батарэйнай вул. № 9-38

адбудзецца продаж з публічнага торгу

маемасьці, належачай гр-ну ГАЕЎСКАМУ ЯНКУ, якая складаецца з 1 драўлянага дому, крытага гонтам, трысьцену да яго і двох хлявушноў.

Маемасьць ацэнена да пачатку таргоў у суме 1400 руб. на спагнаньне па выканаўчых лістох нарсудзьдзі 18 вуч. Менск. акр. 1233 р. 49 к. на карысьць Адамейка Пятруся, Кляшчонка Мяленція, Шышла Пятруся і інш., у ліку 52 асоб за працу. Жадаючыя прымаць удзел у таргох запрашаюцца на азначаны час на месца торгу.

Падрабязны сьпіс маемасьці можна аглядаць штодня ад 10 да 12 гадзіны дню ў канцэлярыі судвыканаўцы па вул. 3-га Інтэрнацыяналу № 20, а ў дзень продажу—на месцы таргоў.

Судовы выканаўца 10 вуч. Менск. акр. ЯХНІЧ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 18
Менскага Гарадзкога Савету
АД 10 КРАСАВІКА 1928 г.
АБ ВЯДЗЕНЬНІ НУМАРАЦЫІ ДАМОЎ, ДАМАВЫХ КНІГ І ВУЧОТУ ЖЫХАРОЎ У г. МЕНСКУ.

У мэтах устанаўленьня парадку дасканалага вядзеньня нумарацыі дамоў, дамавых кніг, вучоту жыхароў у гор. Менску, Менскі Гарадзкі Савет **пастанаўляе:**

1) Дамаўласьнікі, арандатары і кіраўнічыя дамамі, якія належаць Камгасу, Ваенведу, Жылтаварыствам і іншым дзяржаўным і грамадзкім установам, трымацелі і кіраўнічыя гасьцініц, заежджых дамоў, мэбляваных пакояў, пастаялых двароў абавязаны весьці ў установленых кнігах запісы аб пражываючых, а таксама вывесіць унутры двароў на відных мясцох дошкі (дзе іх няма) з нумарамі кватэр, альбо гасьцініцы і прозьвішча пражываючых паасобна—кватэра і пакой наймацелю.

Кожнае домаўладаньне павінна мець чарговы нумар—чатны на правай старонцы вуліцы.

Кожная кватэра павінна быць занумаравана, прычым чарговы нумар павінен быць зьмешчан на дзьвярох кватэры.

2) У дамавую кнігу павінны быць унесены ўсе бяз выключэньня пражываючыя і часова прыбыўшыя, па аднэй асобе ў кожнай асобнай графе, з азначэньнем дакладных вестак аб кожнай асобе паасобку.

Увага 1: Дзеці (родныя), якія не дасягнулі 14-гадовага ўзросту, уносяцца ў адпаведную графу на картку маці (калі яны заяўляюцца адначасова з ёй), а пры адсутнасьці апошняй—бацькі пры тых-жа ўмовах.

Увага 2: Дзеці, якія не дасягнулі 14-гадовага ўзросту, але пражываюць асобна ад бацькоў, роўна і тыя, што жывуць з бацькамі, але носяць іншыя прозьвішчы, павінны быць зьмешчаны на асобных картках.

Увага 3: Прыпісаныя на картках бацькоў дзеці на дасягненьні 14 гадоў павінны быць пераяўлены на асобных картках.

3) Кожная новапрыбываючая асоба павінна быць упісана ў дамавую кнігу з выпіскай адначасова карткі для прыбываючых, якая здаецца ў Аддзяленьне Міліцыі безадкладна.

Увага: Калі прыбыўшая асоба прабыла кароткі час і выбыла да пачатку прыпіскі ў Аддзяленьні Міліцыі, на яе ў момант выбыцьця выпісваецца картка для выбываючых, якая разам з карткай для прыбываючых (перакрэсьленай) на наступны дзень здаецца пры дамавой кнізе ў Аддзяленьне Міліцыі.

4) У паведамленьні адпаведнаму Аддзяленьню Міліцыі аб прыбываючых у дамы і выбываючых з іх належыць выконваць наступныя правілы:

Аб прыбыўшых дастаўляюцца зьвесткі на адрасных картках для прыбываючых, а аб выбыўшых—на картках для выбываючых; усе зьвесткі на адрасных картках павінны быць напісаны чарнілам выразна і без памылак; ніякіх паправак, перакрэсьліваньняў, прыпісак, падчыстак, хоць-бы і агавораных, у адрасных картках не дапушчаецца.

5) Камандны склад Чырвонай арміі і, наогул, вайскова-служачыя, пражываючыя ў інтэрнатах Ваенведу, падлягаюць прыпісцы на агульных падставах.

Гэта правіла абавязкова і для ўсіх пражываючых у дамох чыгунак і на станцыях чыгунак, якія знаходзяцца ў чарце гораду.

6) Не падлягаюць заяўцы чырвонаармейцы, якія знаходзяцца ў палках і камандах (калі яны не жывуць на прыватных кватэрах у горадзе), знаходзячыся на лячэньні ў больніцах, утрымліваемыя ў месцах заключэньня і не дасягнуўшыя 14 гадоў, якія жывуць у абшчажыцьцях дзіцячых дамоў і тэрнатах.

7) Усіх асоб, зьмяніўшых кватэры, альбо выбыўшых, дамаўласьнікі, арандатары і кіраўнічыя дамамі парадкам, указаным у п. п. 3 і 4 гэтых правіл, павінны вывяць з паясьненьнем, куды выбылі і зрабіць аб гэтым зьмены на дошках дамоў.

Увага: Асобы, якія выяжджаюць часова, выяўляюцца: рабочыя і служачыя ў прадпрыёмствах і ўстановах, калі яны выбываюць больш, як на 12 дзён і іншыя асобы—больш 3-х дзён.

8) Усе асобы, якія займаюць асобныя кватэры, абавязаны безадкладна паведаміць дамаўласьнікам і кіраўнічых дамоў аб кожнай асобе, як